Пралетары усіх краіў, злучайцеся!

Зьвязда

№ 269 (3377) Панядзелак 25 лістапада 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, гаспадарка—781

ЛЁНДАН, 24. У Яфе і іншых гарадох Палестыны абвешчана ўсеагульная забастоўка пратэсту супроць арышту арабаў, якія абвінавачваюцца ў „супроцьурадовай агітацыі".

ПАРЫЖ, 24. Ад 1 сакт. ноч. Сьвітанак.

ПАРЫЖ, 24. Ад 1 сакт. ноч. Сьвітанак.

Апошнія навіны Б. С. С. Р.

СЛАЎКАЕ. (Наш кар.). Выязная сесія Аршанскага акруговага суду на працягу 6 дзён у чыгуначным клюбе на станцыі Слаўкае слухала справу аб зьверскім забойстве загадчыцы чыгуначнай школы т. Хілінскай.

Выязная сесія прыгаварыла забойцаў т. Хілінскай Хрыпача, Кавалёва і Бараўцова да вышэйшай меры пакараньня —расстрэлу.

СУПРОЦЬ НОВЫХ ПРАВАКАЦЫЙ

Зусім яшчэ нядаўна шырокая савецкая грамадзкасьць была абурана правакацыйнай кампаніяй усёй польскай прэсы, накіраванай супроць Савецкага Саюзу і нашага Поўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве. Мы адзначалі, што гэта кампанія стаіць у цеснай сувязі з узмацненьнем падрыхтоўкі да вайны супроць Савецкага Саюзу з боку польскага фашызму. Мы ня верылі і ня верым пацыфісцкай балбатні пана Галуўко, які прабаваў фразамі аб «дружных» адносінах да Савецкага Саюзу прыкрыць наглыя правакацыі польскіх імпэрыялістых і ўзмоцненую работу па падрыхтоўцы контр-рэвалюцыйнага паходу на Савецкую Украіну і Савецкую Беларусь.

Некалькі дзён таму назад у Польшчы адбылося новае выступленьне супроць нашага савецкага прадстаўніцтва. У Львове група украінскіх фашысцкіх «студэнтаў» напала на наша савецкае консульства, «пратэстуючы» супроць арыштаў контр-рэвалюцыйных элемэнтаў, зробленых у апошні час у Кіеве. Бандыцкае выступленьне украінскіх фашыстых было фактычна падтрымана польскай паліцыяй і на наступны-ж дзень падхоплена чарговым зласьлівым выцьцём усяе фашысцкае прэсы супроць Савецкага Саюзу і Савецкай Украіны.

У справе падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу актыўнымі памочнікамі і саюзьнікамі польскага фашызму зьяўляюцца Заходня-Украінская і Заходня-Беларуская буржуазія і кулацтва. Беларускія і украінскія нацыянал-фашыстыя вядуць самую актыўную антысавецкую работу і, будучы на простай службе польскіх акупантаў, імкнуцца скампрамэтаваць у вачох працоўных мас вялікую справу сацыялістычнага будаўніцтва, якое адбываецца тут, у нас, у Савецкіх рэспубліках Беларусі і Украіны. Заходня-Украінскія і Заходня-Беларускія нацыянал-фашыстыя ў адкрытым саюзе з польскім фашызмам заклікаюць да ўзброенага паходу супроць Савецкага Саюзу. Характэрна, што за некалькі дзён да правакацыйнага выступленьня кучкі украінскіх фашыстых у Львове супроць нашага консульства, адбылося выступленьне буржуазнага украінскага соймавага клюбу супроць Савецкай Украіны.

Выкрыцьцё контр-рэвалюцыйнай змовы на Савецкай Украіне і арышт удзельнікаў гэтае змовы выклікалі выступленьне салідарнасьці з контр-рэвалюцыянэрамі з боку польскіх і украінскіх фашыстых. Гэтае чульлівае адношэньне контр-рэвалюцыі лепш усяго яшчэ раз і усім выразнымі словамі канстатуе поўны пераход Заходніх-Украінскіх буржуазных партый у лягер польскага фашызму. Арыштаваныя контр-рэвалюцыянэры у Кіеве, зьвязаныя з пятлюраўскім цэнтрам, якія працавалі, як агенты замежнай дзяржавы і ставіўшыя сабе мэтаю зьняволеньне савецкай улады, падтрыманы польскай фашысцкай і украінскай нацыянал-фашысцкай прэсай. Для нас няма ніякага сумненьня, што ўсё гэта зьвязаны ў адным ланцугу падрыхтоўкі новых ваенных авантур супроць Савецкага Саюзу.

Ад Заходня-Украінскіх нацыянал-фашыстых не адстаюць і Заходня-Беларускія фашыстыя. Ва унісон з усёй фашысцкай прэсай віленскія беларускія нацыянал-фашысцкія газэты вядуць самую зласьлівую кампанію супроць Савецкай Беларусі і Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі. Простая салідарнасьць з контр-рэвалюцыйнымі нацыянал-дэмакратычнымі элемэнтамі з БССР, адкрытыя заклікі да вайны супроць Савецкай Беларусі выкрываюць гэтых паноў, як яўных агентаў польскай акупацыі і актыўнейшых памочнікаў у справе падрыхтоўкі анты-савецкай вайны.

Зусім ясна, што адказнасьць за выступленьні групкі «студэнтаў» падае на польскі ўрад. Толькі ў абстаноўцы бяскарнага цкаваньня нашага поўнамоцнага прадстаўніцтва, патураньня ўлады, толькі ў атмасфэры няспынага паклёпу па адрасе Савецкага Саюзу маглі адбывацца падобныя падзеі ў Польшчы. Польская фашысцкая паліцыя, якая надзвычайна шчыра разганяе дэманстрацыі рабочых, страляе ў дэманстрацыі варшаўскай рабочай моладзі і забівае і раніць дзесяткі людзей, зьяўляецца няпрысутнай у часе выступленьня 20-ці хуліганаў супроць нашага Львоўскага консульства. Цяпер, пад выглядам «абароны» консульства польская паліцыя распраўляецца з непажаданымі для яе украінскімі рэвалюцыйнымі арганізацыямі. Але гэтымі правакацыйнымі ўчынкамі польскаму ўраду ня ўдасца адхіліцца ад адказнасьці за напад на наша консульства.

Працоўныя масы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі вядуць рашучую рэвалюцыйную барацьбу супроць польскага фашызму і яго саюзьнікаў —украінскага і беларускага нацыянал-фашызму. У адказ на контр-рэвалюцыйнае выступленьне салідарнасьці з анты-савецкімі элемэнтамі Украіны з боку нацыянал-фашыстых Зах. Украіны і Зах. Беларусі працоўныя масы ўсёй Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны яшчэ больш узмоцняць сваю барацьбу супроць ваеннай небясьпекі, супроць нацыянал-фашыстых і яшчэ актыўней падкрэсьляць сваю салідарнасьць з працоўнымі масамі Савецкай Беларусі і Савецкай Украіны, якія вядуць вялікую работу па сацыялістычным будаўніцтве. Рабочыя і бядняцка-сераднякцкае сялянства Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі яшчэ актыўней выкажуць сваю салідарнасьць з тэй бязьлітаснай барацьбой, якую вядзе пралетарская дыктатура супроць усіх ворагаў рэвалюцыі, супроць тых, хто зрывае сацыялістычнае будаўніцтва, супроць тых, хто марыць вярнуць уладу памешчыкаў і фабрыкантаў.

Новае правакацыйнае выступленьне украінскіх фашыстых, узмацненьне антысавецкай кампаніі з боку беларускіх нацыянал-фашыстых, узмацненьне паклёпу і цкаваньня па адрасе Савецкага Саюзу з боку польскай фашысцкай прэсы выкліча самы рашучы пратэст і абурэньне шырачайшых мас усяго Савецкага Саюзу. Ваенныя авантуры польскіх імпэрыялістых сустрэнуць руйнуючы адпор мільённых мас рабочае клясы і працоўнага сялянства, якія пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, перамагаючы і ломячы супраціўленьне контр-рэвалюцыйных элемэнтаў, пасьпяхова ідуць наперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Працоўныя масы Савецкай Беларусі салідарна з працоўнымі Савецкай Украіны і ўсяго Савецкага Саюзу, выказваючы свой рашучы пратэст супроць нападаў на савецкае консульства ў Львове, патрабуюць сапраўдных віноўнікаў гэтага нападу—польскі ўрад—да адказу.



Новы сакратар ЦК ЛКСМБ тав. ПАЛЯКОЎ

****

Адкрыўся 2-гі зьезд працоўных латышоў

Учора ў залі пасяджэньняў ЦВК адкрыўся 2-гі ўсебеларускі зьезд працоўных латышоў. На зьезд прыбыло 105 дэлегатаў з усіх округ Беларусі. У працы зьезду прымаюць удзел прадстаўнікі латсэкцыі ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ т. Иокум і Сандар і прадстаўнікі латыскіх цэнтральных газэт

З дакладам аб міжнародным і ўнутраным становішчы выступіў старшыня СНК т. Галадзед.

Зьезд віталі прадстаўнікі яўрэйскіх, польскіх і латыскіх калгасаў, рабочыя чыгуначнікі, прадстаўнікі чырвонай армії і менскіх рабочых прадпрыемстваў. Зьездам адпраўлены прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, Ураду БССР і Далёка-Усходняй армії.

К канцу пяцігодкі на палёх СССР будуць працаваць 1½ мільёна трактараў

МАСКВА, 23. Паводле новага пляну трактарабудаўніцтва, 5 заводаў будуць выпускаць к канцу пяцігодкі каля 210 тысяч трактараў у год. Такім чынам, к канцу пяцігодкі калі ўлічыць выхад са строю часткі трактараў з прычыны зношанасьці, на палёх СССР будуць працаваць 1½ млн. трактараў. Яны змогуць апрацаваць каля ¼ мільярду гэкт., г. зн. у два разы больш, чым узораная ў сучасны момант плошчы.

Паводле пляну трактарацэнтру, у 1932-33 г. на Паўночным Каўказе будзе працаваць 120 машына-трактарных станцый, на Украіне 285 станцый, у Сярэдня-Волскім краі—95, у Ніжня-Волскім—90 у ЦЧВ і Уралвобласьці—160 станцый і г. д. У раёнах будаўніцтва станцый сельская гаспадарка будзе расьці бурным тэмпам.

Для выкананьня вялізарных праграм рэконструкцыі сельскае гаспадаркі патрабуецца да 2-х мільярдаў руб., з іх каля 500 млн. руб. будуць пакрыты сялянамі шляхам набыцьця імі акцый Трактарацэнтру. (ТАСС).

ПОСЬПЕХІ 3-й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

МАСКВА. Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на 21-га лістапада дасягнула па СССР 831,7 млн. руб. (ТАСС).

НАЗНАЧЭНЬНЕ ТАВ. СЭРАБРОЎСКАГА ЧЛЕНАМ ПРЭЗЫДЫУМУ ВСНГ СССР

МАСКВА. Апублікавана пастанова СНК Саюзу ССР аб назначэньні членам прэзыдыуму ВСНГ СССР т. А. Сэраброўскага. (ТАСС).

ПЛЕНУМ ЦК УсеЛКСМ

МАСКВА, 24. 1-га сьнежня адкрываецца 6-ты пленум ЦК УсеЛКСМ.

Пралетары—на будаўніцтва калгасаў

ЗА НЕДАКЛАДНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПАСТАНОЎ АПОШНЯГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б)

Ініцыятыва рабочых друкарні „Зьвязда" і хлебазаводу

ДРУКАРНЯ „ЗЬВЯЗДЫ" ПАСЫЛАЕ НА СТАЛУЮ ПРАЦУ У КАЛГАС 1-го РАБОЧАГА

Рабочыя і служачыя друкарні і рэдакцыі „Зьвязды" выклікаюць пасьледаваць іх прыкладу рабочых усіх прадпрыемстваў БССР

Учора адбыўся агульны сход рабочых і служачых ДРУКАРНІ І РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА», на якім абгаворвалася пастанова лістападаўскага пленуму аб выніках і далейшых задачах калгаснага будаўніцтва.

Выступаўшыя ў спрэчках рабочыя і служачыя адзначылі, што, наперакор фальшывым тэорыям підэраў правай апазыцыі аб «дэградацыі» сельскай гаспадаркі, мы маем надзвычайна моцны рост калектыўных гаспадарак, рост прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі на аснове разьвіцьця аграмаджанага сэктару.

Важнейшая задача дня—УСЯМЕРНАЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ ПРАЛЕТАРСКАГА КІРАЎНІЦТВА КАЛГАСНЫМ РУХАМ. ВЁСКА ПАТРАБУЕ ШМАТ АРГАНІЗАТАРАЎ І КІРАЎНІКОЎ КАЛГАСАЎ.

Агульны сход у сваёй рэзалюцыі ўхваліў пастанову пленуму ЦК аб пасылцы на вёску 25 тысяч лепшых рабочых для арганізацыі і ўзмацненьня калектыўных гаспадарак.

СХОД ПАСТАНАВІЎ ПАСЛАЦЬ НА ПАСТАЯННУЮ РАБОТУ Ў КАЛГАС НЯ МЕНШ ЧЫМ НА АДЗІН ГОД АДНАГО РАБОЧАГА. ЯГО ЎТРЫМАНЬНЕ БЯРЭ НА СЯБЕ ЎВЕСЬ КАЛЕКТЫЎ ДРУКАРНІ І РЭДАКЦЫІ

АГУЛЬНЫ СХОД, АКРАМЯ ТАГО, ПАСТАНАВІЎ СВАІМІ СІЛАМІ І СРОДКАМІ Ў ПАРАДКУ ГРАМАДЗКАЙ НАГРУЗКІ ВЫПУСКАЦЬ ДРУКАВАНУЮ ГАЗЭТУ ДЛЯ ПАДШЭФНАЙ КАМУНЫ Ў КАСЬЦЮКОВІЦКІМ РАЁНЕ.

РАБОЧЫЯ ДРУКАРНІ «ЗЬВЯЗДА» ВЫКЛІКАЛІ ПАСЬЛЕДАВАЦЬ ІХ ПРЫКЛАДУ РАБОЧЫХ 1-ай ДРУКАРНІ І АКАДЭМІІ НАВУК.

Рабочыя ўпэўнены, што іх пачынаньне будзе падтрымана шырокімі рабочымі масамі БССР.

РАБОЧЫЯ ХЛЕБАЗАВОДУ ПАСТАНАВІЛІ ВЫЛУЧЫЦЬ ДВУХ ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ ДЛЯ ПРАЦЫ Ў ВЁСЦЫ

Заслухаўшы даклад тав. Чалядзінскага аб задачах калгаснага будаўніцтва, сход рабочых Менскага хлебазаводу поўнасьцю ўхваляе ўсе пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), накіраваныя на далейшае разьвіцьцё і ўмацаваньне сацыялістычнага будаўніцтва.

Сход ухваляе пастановы пленуму аб рашучай барацьбе з правымі апартуністых, якія падрываюць сацыялістычнае будаўніцтва.

Абгаварыўшы рашэньні пленуму аб пасылцы 25 тысяч рабочых з вытворчасьці ў вёску для кіраўніцтва калгасным рухам, сход аднагалосна пастанаўляе: вылучыць з свайго калектыву двух лепшых рабочых на доўгую працу ў вёску тэрмінам ня менш, чым на год, забясьпечыўшы іх поўным утрыманьнем за кошт усяго калектыву рабочых хлебазаводу. Сход даручае ФЗК падабраць адпаведныя кандыдатуры і прапрацаваць пытаньні па забесьпячэньні камандыруемых таварышоў сталай пэнсіяй ня меншага разьмеру іх агульнага заработку на прадпрыемстве.

Сход заклікае ўсіх рабочых г. Менску пасьледваць прыкладу рабочых друкарні «Зьвязда» і хлебазаводу.

Шэфы, перабудоўвайце сваю работу!

Аб сельска-гаспадарчых кадрах мы гаварылі даўно. Але ніколі яшчэ гэтае пытаньне ня было так завострана, як у апошні час. Яшчэ зусім нядаўна «Зьвязда» прыводзіла сумныя даныя аб абслугоўваньні Клімавіцкага раёну масавай калектывізацыі. Аб гэтым-жа гаварылі на сэсіі ЦВК БССР, якая зараз адбываецца. Аналёгічны малюнак наглядаецца па ўсіх раёнах Савецкай Беларусі. З беларускай вёскі, якая перабудоўваецца на сацыялістычны лад, чуцён крык—дайце кадры, дайце людзей!

Тэмп калектывізацыі ў БССР перавысіў усякія плянавыя меркаваньні. Гэтыя пляны на будучы час перагледжаны ў бок іх значнага павялічэньня. Але ўжо зараз можна сказаць, што і павялічаныя пляны застануцца ззаду. З кожным днём сацыялістычная перабудова беларускай вёскі разгортваецца ўсё мацней і мацней, калектывізацыя разьвіваецца шалёным тэмпам, пэрыяд калектывізацыі толькі асобных вёсак праходзіць, а ў радзе месц ужо прайшоў, зараз гутарка ідзе ўжо аб калектывізацыі цэлых раёнаў і нават округ.

Побач з гэткім тэмпам, у беларускай вёсцы абвастрылася клясавая барацьба. Кулак са скуры лезе, каб затрымаць, перашкодзіць разгортваньню калектывізацыі. Кулак мяняе свае мэтады барацьбы: там, дзе нельга школдзіць адкрыта, ён дзейнічае «тихой сапой». Ці трэба пры гэткіх абставінах гаварыць аб неабходнасьці тэрміновага накіраваньня ў вёску практычных і вытрыманых кадраў: палітычных працаўнікоў, гаспадарнікаў, аграномаў, арганізатараў! Толькі забясьпечыўшы вёску кадрамі і, галоўным чынам, палітычнымі працаўнікамі, можна сур'ёзна гаварыць аб замацаваньні ўжо дасягнутых посьпехаў у галіне калектывізацыі, аб яе далейшым росьце, аб тым, каб выбіць кулака з занятых ім адкрытых і скрытых пазыцый.

Адкуль узяць людзей? Выразны адказ на гэтае пытаньне мы знаходзім у пастанове апошняга пленуму ЦК Усе КП(б). «Магутным рэзэрвам,—гаворыцца ў гэтай пастанове,—з якога павінны чэрпацца кіруючыя кадры сацыялістычнага земляробства, што зараз будуецца, зьяўляюцца індустрыяльныя рабочыя».

ЦК лічыць неабходным, акрамя сыстэматычнага ўзмацненьня калгаснага руху партыйнымі кіраўнічымі сіламі, накіраваць у вёску на працягу бліжэйшых месяцаў на работу ў калгасы машына-трактарныя станцыі, куставыя аб'яднаньні і г. д., ня менш 25 тысяч рабочых з належным арганізацыйна-палітычным вопытам. У падборы гэтых рабочых прафсаюзы павінны прымаць актыўны ўдзел, вылучаючы найбольш перадавых рабочых.

Газэтныя весткі гавораць аб тым, што рабочыя раду гаралоў СССР ужо пайшлі па гэтым шляху. Уперадзе—Паўночны Каўказ, рад буйнейшых прадпрыемстваў якога ўжо пастанавілі накіраваць у вёску лепшых рабочых для працы па калектывізацыі на доўгі тэрмін.

Пастанова апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) абавязвае нас паставіць гэтае пытаньне ва ўсю сваю шырыню, са ўсёй сваёй рашучасьцю, і зараз-жа. Беларуская вёска, умовы якое больш складаныя, чым вёскі іншых раёнаў Савецкага Саюзу, павінна ў самы бліжэйшы час атрымаць патрэбных ёй працаўнікоў. Беларускі рабочы павінен пайсьці ў вёску і прыняць актыўны ўдзел у яе сацыялістычнай перабудове.

Ініцыятыву ў гэтай справе ўчора выявілі рабочыя друкарні «Зьвязда», якія на сваім агульным сходзе пастанавілі вылучыць са свайго* асяродзішча аднаго рабочага для накіраваньня яго на сталую працу ў вёску. Па гэтым прыкладзе павінны пайсьці рабочыя прадпрыемстваў Менску і іншых гарадоў БССР.

Вылучаныя прадпрыемствамі рабочыя павінны прайсьці кароткатэрміновыя курсы з тым, каб атрымаць належную падрыхтоўку ў справе ажыцьцяўленьня даручаных ім задач.

Сучасны момант высоўвае перад шэфскімі таварыствамі неабходнасьць перабудовы сваёй працы, прыстасаваньня яе да патраб калектывізацыі. Зусім зразумела, што ранейшыя мэтады працы шэфскіх т-ваў ня могуць нас задаволіць. Шэфскія т-вы павінны паставіць перад сабой задачу канкрэтнай дапамогі калектывізацыі. Да апошняга яшчэ часу праца шэфтаварыстваў у гэтай галіне не давала належных вынікаў. Гэта гаворыць аб тым, што трэба перабудаваць самы мэтад працы. І сапраўды, у чым выяўляецца зараз дапамога шэфаў у галіне калектывізацыі? У лепшым выпадку, шэфы наяжджаюць у вёску час ад часу, па нядзелях або ў іншыя сьвяты. Справа абмяжоўваецца тым, што шэфы склічуць сход беднаты, пагавораць аб калектывізацыі і, дабіўшыся ў большасьці выпадкаў спачуваньня, ад'яжджаюць, каб праз некалькі тыдняў зноў зрабіць «наезд». У свой новы прыезд шэфы ставяць пытаньне аб калектывізацыі ўжо на агульным сходзе, але тут толькі і выяўляецца ўся бескарыснасьць праведзенай імі працы. Беднота, раней раней з'агітаваная імі на ўступленьне ў калгас, на агульным сходзе ў лепшым выпадку маўчыць, не выяўляючы адкрыта жаданьня ісьці ў калгас. У большасьці выпадкаў аказваецца, што за час адсутнасьці шэфаў кулак здолеў зрабіць належны ўплыў на беднату і пагрозамі або абяцаньнямі дабіўся яе нейтралітэту.

Трэба, нарэшце, адмовіцца ад мэтаду «наезьніцтва» і перайсьці да сыстэматычнай і глыбокай працы ў вёсцы. Кожнае шэфтаварыства павінна паставіць перад сабою цьвёрдую задачу—дабіцца пераходу падшэфнай вёскі ў калгас. А гэта, як паказаў ужо вопыт, можа быць ажыцьцёўлена толькі тады, калі шэфтаварыства пашле ў падшэфную вёску практычнага і стойкага таварыша, калі вылучаны таварыш прасядзіць у вёсцы 2-3 месяцы і не адседзе алтуль, пакуль ня выканае даручанай яму задачы. Толькі пры наяўнасьці ў вёсцы спрактыкаванага, палітычна-пісьменнага чалавека, які здолеў-бы даць належны адпор кулацкім байкам, растлумачыць бядняцка-сераднякаму сялянству, што такое калгас шэфтаварыства дае'ецца сваёй мэты.

Практыка паказала, што найлепшым сродкам агітацыі за калгас зьяўляецца пасылка дэлегацыі з сялян падшэфнай вёскі ў калгас для азнаямленьня на месцы з яго жыцьцём. Дэлегацыя, азнаёміўшыся з дрэннымі і добрымі калгасамі, уявіўшы сабе прычыны слабасьці першых і дабрабыт у другіх, заўсёды выкажацца за арганізацыю калгасаў. У справе стварэньня дэлегацыі дапамогу і павінны аказаць шэфскія т-вы. Трэба, каб шэфы ня толькі арганізоўвалі дэлегацыю, але і ажыцьцяўлялі гэта мерапрыемства за свой кошт. Гэта зьявіцца адным з лепшых мэтадаў матар'яльнай дапамогі шэфаў вёсцы.

Пасылка рабочых з прадпрыемстваў, у ажыцьцяўленьне апошняй пастановы пленуму ЦК УсеКП(б), накіраваньне ў вёску прадстаўнікоў шэфтаварыстваў павінна быць ажыцьцёўлена ў тэрміновым парадку. Гэтым пытаньнем павінна зараз-жа заняцца наша грамадзкасьць. У бліжэйшы дні прафсаюзам, шэфтаварыствам, прадпрыемствам трэба склікаць сходы рабочых, на якіх узьняць і канкрэтна вырашыць закранутыя пытаньні.

Трэба памятаць, што «пакуль прамысловыя рабочыя ўсутыч ня возьмуцца за практычнае падтрыманьне справы калектывізацыі ў вёсцы, нічога тры валага, нічога сапраўды надзейнага, нічога сапраўды сацыялістычнага ў будаўніцтве калгасаў,—калгасаў, якія ахапляюць сапраўды шырокія бядняцка-сераднякцкія масы,—ня будзе». (Молатаў).

ВЭН.

Клясавая барацьба ў Зах. Эўропе

Месячнік дэмонстрацый і забастовак пратэсту ў Румыніі

Рабочыя дамагаюцца вызваленьня палітвязьняў

ВЕНА, 24. Рада ўнітарных прафсаюзаў Румыніі і рабоча-сялянскі блёк правядуць з 15-га лістапада месячнік мітынгаў, дэмонстрацый і забастовак пратэсту з мэтаю садзейнічаньня арганізацыйнаму ўзмацненьню унітарных прафсаюзаў, каб прымусіць урад вызваліць рабочых, арыштаваных у сувязі з гадзівіаю Кастрычніка, якіх катуюць у турмах.

Першая масавая дэманстрацыя адбылася ў Бухарэсьце 20-га лістапада. Дэманстранты, пераважна беспрацоўныя, прайшлі на галоўных вуліцах да міністэрства працы і замежных спраў, нясучы плякаты з надпісамі: «Патрабуем хлеба і дапамогу для беспрацоўных», «Прэч вайну супроць СССР». Паліцыя разагнала дэманстрантаў і многіх арыштавала.

Орган унітарных прафсаюзаў Румыніі «Віаца Мунчытоара» паведамляе, што ўнітарныя прафсаюзы арганізуюць пасылку рабоча-сялянскай дэлегацыі ў СССР. Дэлегаты будуць выбірацца на заводах, капальнях, а таксама ў вёсках. (ТАСС).

ПАСЬЛЯ 7-мі ТЫДНЯЎ ГАЛАДОЎКА Ў ДАФТАНСКАЙ ТУРМЕ СПЫНЕНА

БУХАРЭСТ, 24. 38 палітзьняволеных Дафтанскай турмы спынілі галадоўку пратэсту супроць жорсткасьці турэмнага рэжыму. Галадоўка працягвалася 7 тыдняў. Большасьць галадаўшых надта аслабелі і жыцьцю іх пагражае небясьпека.

ЗНОЎ ГАЛАДОЎКА Ў БУДАПЭШЦКАЙ ТУРМЕ

ВЕНА, 24. Газэта «Абэнд», паведамляе, што пасьля добраахвотнага спыненьня галадоўкі палітзьняволеных Вэнгрыі, турэмная адміністрацыя пачала ўжываць да іх, як помсту, рэпрэсыі. У сувязі з гэтым палітзьняволеныя Будапэшцкай акруговай турмы: пачалі новую галадоўку. Сярод галадуючых Матыяс Ракошы і яго сястра, арыштаваная нядаўна. (ТАСС).

МАСАВАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ У БУХАРЭСЬЦЕ

ВЕНА, 23. У Бухарэсьце адбылася 20-га лістапада масавая дэманстрацыя беспрацоўных. Адбыліся сутычкі з паліцыяй, якая арыштавала шмат удзельнікаў дэманстрацыі. (ТАСС).

ПОМСТА РУМЫНСКІХ БАЯР НАД РАБОЧЫМІ ЗА ЎДЗЕЛ Ў КАСТРЫЧНІЦКІХ ДЭМАНСТРАЦЫЯХ

ВЕНА, 18. Як паведамляюць з Бухарэсту, суд пасьля 2-хдзённага перапыну закончыў справу праваслыроў рабочых, арыштаваных за ўдзел у вулічнай дэманстрацыі ў дзень 12 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Трое абвінавачаных прыгавораны да аднаго месяца зьняволеньня ў турме кожны, адзін да аплаты штрафу ў 10 тысяч лей, адзін апраўданы.

Вэнгерскія гарнякі трымаюцца стойка

ВЕНА, 22. Забастоўка вэнгерскіх гарнякоў у Шалгатар'яне працягваецца. Пробы прадпрыемцаў зламаць супраціўленьне гарнякоў, пагрозы лёкаўтам і высяленьнем з кватэр не далі вынікаў. Адміністрацыя таксама ідзе на абвастраньне рэпрэсый. Яна выключыла электрычнасьць у рабочых кватэрах і адмовілася выплаціць рабочым апошнюю зарплату. На ўчарашным сходзе бастуючых па прапанове рэвалюцыйнага крыла прафсаюзу аднагалосна пастанаўлена ня прымаць да ведама перагавораў, якія вядуць рэфармістыя з адміністрацыяй капальнь і працягваць забастоўку.

Суровай кары патрабуюць навуковыя працаўнікі Менску контррэвалюцыянэрам Яфрэмаву, Альдэнбургу і інш.

23 лістапада г. г. у клюбе навуковых працаўнікоў адбыўся агульны сход навуковых працаўнікоў гор. Менску. На сходзе было зроблена нечарговае паведамленьне аб контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «Сьпілка вызволеньня Украіны», выкрытай органамі УДПУ, удзельнікам якое разам з іншымі контр-рэвалюцыянэрамі зьяўляўся член Усеукраінскай Акадэміі Навук С. А. Яфрэмаў і інш. супрацоўнікі Акадэміі.

Па зробленым паведамленьні выступілі наступныя асобы: праф. Рубашоў, Гаўсман, Смоліч і Цьвікевіч, якія ў сваіх прамовах рашуча асудзілі дзеяньні Яфрэмава і інш. членаў Украінскай Акадэміі патрабуючы самага суровага пакараньня контр-рэвалюцыянэраў.

Адначасна яны ганьбілі паводзіны контр-рэвалюцыйнай групы Усесаюзнай Акадэміі Навук на чале з акадэмікам Альдэнбургам і Платонавым.

Сход прыняў наступную рэзалюцыю.

Заслухаўшы нечарговае паведамленьне аб выкрыцьці УДПУ контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «Сьпілька вызволеньня Украіны», удзельнікамі якое разам з іншымі контр-рэвалюцыянэрамі зьяўляліся члены Усеукраінскай Акадэміі Навук С. А. Яфрэмаў і інш. навуковыя працаўнікі Акадэміі і якая ставіла сваёй мэтай аднаўленьне капіталістычнае ўлады, звароту абшарнікаў і закабаленьня рабочых і сялян Украіны.—агульны сход навуковых працаўнікоў г. Менску патрабуе ад Савецкае ўлады, самага суровага пакараньня контр-рэвалюцыянэраў—здрадлікаў Яфрэмава і яго падсобнікаў, скарыстаўшых давер'е пралетарскай дзяржавы і савецкіх навуковых устаноў для падрыўной працы на карысьць зьлейшых ворагаў рабочае клясы і працоўнага сялянства.

Разам з гэтым сход, асудзіўшы паводзіны контр-рэвалюцыйнай групы Усесаюзнай Акадэміі Навук на чале з акадэмікамі Альдэнбургам і Платонавым, таксама патрабуе суровага пакараньня асоб, скарыстаўшых сваю працу ў Акадэміі ў контр-рэвалюцыйных мэтах.

Злачынствы украінскіх і ленінградзкіх контр-рэвалюцыянэраў яшчэ мацней згуртуюць лепшую і адданую пралетарскай рэвалюцыі частку навуковых працаўнікоў навакол Савецкай улады і Камуністычнай партыі ў справе пабудовы сацыялізму і абароны нашай пралетарскай краіны ад унутранай контр-рэвалюцыі і замежнага контр-рэвалюцыйнага нападу.

Сьмерць ворагам рэвалюцыі!

Суровае пакараньне ўсім контр-рэвалюцыянэрам!

Як разбройваюцца імпэрыялістыя

ТОКІЁ, 20. Паводле паведамленьня «Джапан Адвэртайсэр» з Вашынгтону, у амэрыканскіх палітычных колах лічаць, што заява брытанскага ўраду аб спыненьні пабудовы сінгапурскае марскае базы зьяўляецца ўступкай у адносінах да Японіі і што Англія гэтым самым хоча дабіцца згоды Японіі на меншую прапорцыю марскіх узбраеньняў. У сувязі з гэтым паведамленьнем прадстаўнікі японскіх марскіх колаў заявілі прадстаўніком друку, што спыненьне пабудовы сінгапурскай базы ні ў якой ступені ня можа мець уплыву на пазыцыю Японіі ў пытаньні аб прапорцыі марскіх узбраеньняў 10:10:7, бо пабудова сінгапурскай базы тэхнічна ўжо закончана. (ТАСС).

ПАРЫЖ, 21. У палітычных колах акцэньваюць паведаньне 20-га лістапада італьянскім паслом Манцоні. Брыяна, як пачатак францускa-італьянскіх перагавораў па пытаньні аб марскіх узбраеньнях. Па вестках друку, гэтыя перагаворы маюць на мэце папершае: узгадніць з пункту гледжаньня абодвых урадаў пытаньне аб падводных лодках, падругое—удакладніць прыстасаваньне прынцыпу паритэту, які ўстаноўлены на Вашынгтонскай канфэрэнцыі аб разбраеньні ў адносінах да францускіх і італьянскіх лінейных караблёў.

ХВАЛЯ ПРАТЭСТАУ У БССР

супроць нападу на Савецкае консульства ў Львове

Рэзалюцыя пратэсту студэнтаў, слухачоў курсаў КСМ, навуковых працаўнікоў і супрацоўнікаў Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя Леніна

Заслухаўшы інфармацыю т. Будзінскага аб бандыцкім нападзе украінскіх фашыстых на Савецкае консульства ў Львове, агульны сход канстатуе:

1. Што эканамічны і палітычны крызіс фашысцкай дыктатуры ў Польшчы, нарастаньне элемэнтаў непасрэднай рэвалюцыйнай сытуацыі, якая находзіць свой адбітак ў росьце рэвалюцыйнай актыўнасьці рабочае клясы і асноўных мас сялянства ўсёй Польшчы і абвастрэньне нацыянальна-вызваленчай барацьбы паняволеных народаў штурхае фашысцкую дыктатуру шукаць выхаду з створанага становішча ва ўзмоцненным націску эканамічным і палітычным на рабочую клясу і асноўныя масы сялянства, ва ўзмацненьні прыпечаньня нацыянальных меншасьцяй і налёзіцыйнай палітыцы, і асабліва ў ліхаманкавай падрыхтоўцы да нападу на СССР—ачаг сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Узмацняецца тэрор у адносінах да працоўных мас (забойства рэвалюцыйных рабочых і сялян фашысцкімі баёўкамі і паліцыяй), шалёнае цкаваньне Савецкага Саюзу і самыя жорсткія прасьлядаваньні тых, хто імкнецца сказаць праўду аб СССР (забойства члена рабоча-сялянскай дэлегацыі т. Гэрмана ў Лодзі).

Ва ўсёй гэтай кампаніі падрыхтоўкі вайны і цкаваньня СССР самых актыўны ўдзел прымаюць сацыял-фашысты (ППС, Бунд, Поалей-цыон і украінскія і беларускія нацыянал-фашысты).

2. Вялікія дасягненьні СССР, БССР і УССР у галіне сацбудаўніцтва, зьвязаныя з рашучым наступленьнем на капіталістычныя элемэнты, (кулака, нэпмана і контр-рэвалюцыйную буржуазную інтэлігенцыю), магутны рост актыўнасьці рабочае клясы і працоўных мас сялянства —усё гэта яшчэ больш павялічвае нянавісьць сусьветнай буржуазіі да СССР і

Рост рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту і асноўных мас сялянства Заход. Украіны і Заходняй Беларусі супроць абшарніцкай эксплёатацыі, у тым ліку і супроць беларускай і украінскай буржуазіі і кулацтва, садзейнічалі пераходу гэтых апошніх да адкрытага падпарадкаваньня польскаму фашызму і спробам непасрэднага пынічнага ўцягненьня імі украінскіх і беларускіх працоўных мас ў рыхтуемы польскім фашызмам ваенны напад на БССР і УССР.

У гэтай контр-рэвалюцыйнай працы прымаюць непасрэдны ўдзел усе варожыя сацыялістычнаму будаўніцтву ў СССР сілы—кулак, нэпман, а таксама і іх ідэолёгі, розныя нац. шавіністыя і на Украіне—украінскія. а на Беларусі —беларускія нацыянал-дэмакраты.

Партыйнае будаўніцтва

Да працэсу ЦК баўгарскае кампартыі

Папярэдняе сьледзтва канчаецца!..

ПРАЦЭС 52 РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ У БАЎГАРЫІ

ВЕНА, 22. Як паведамляюць з Софіі (Баўгарыя), там пачаўся масавы працэс 52 рабочых рэвалюцыянэраў на чале з т. Стаянавым. Стаянаву прад'яўляецца абвінавачаньне, што ён быў сакратаром нелегальнай баўгарскай кампартыі. На суд выклікана звыш 100 сьведак.

У першы дзень працэсу суд прыступіў да допыту Стаянава. Стаянаў выкрыў палітычную мэту працэсу і абрысаваў сыстэму катаваньняў, якія ўжываюцца баўгарскай паліцыяй і судовымі органамі. Стаянаў узяў назад свае паказаньні ў судовага сьледчага, ЯК ВЫМУШАНЫЯ НЕЧАЛАВЕЧЫМІ КАТАВАНЬНЯМІ.

У першы дзень працэсу перад будынкам суда рабочыя арганізавалі рэвалюцыйную дэманстрацыю пратэсту супроць клясавай юстыцыі і рэжыму тэрору, за ўсеагульную амністыю і легалізацыю камуністычнай партыі і іншых рэвалюцыйных арганізацый баўгарскага пралетарыяту. Паліцыя напала на дэманстрантаў, разагнала іх і арыштавала некалькі рабочых.

СУПРОЦЬ КАМБІНАТАРАЎ І АВАНТУРЫСТЫХ

Адказ тав. Сэмара апартуністым і цідыкам

ПАРЫЖ, 18. Буржуазная і рэфармісцкая прэса зварачае вялікую ўвагу на адыход ад камуністычнай партыі 6-ці муніцыпальных дарадцаў. Падкрэсьліваючы, што 6 муніцыпальных дарадцаў фактычна выйшлі са складу кампартыі, газэты зьмяшчаюць вытрымкі з іх заявы, каб падмацаваць імі свае звычайныя выпады супроць кампартыі. Аднак, побач са злосьцю, у буржуазнай прэсе прасьлізгае і **небясьпека, бо буржуазныя газэты разумеюць, што ачышчэньне камуністычнай партыі ад апартуністычных** элемэнтаў будзе садзейнічаць росту і ўзмацненьню яе ўплыву ў рабочых масах.

Адказваючы буржуазным газэтам на сторонках «Юманітэ», Сэмар піша: «Французская камуністычная партыя можа пацьвердзіць, што пад уплывам партыйных рэпрэсій з партыі выходзяць асобныя члены, **але выходзяць з яе радоў скэптыкі, трусы, стомленыя, якія страцілі веру ў сілы рабочае класы, і людзі, гатовы паддацца буржуазіі.** Выходзяць таксама **авантурыстыя і камбінатары,** якія імкнуліся зрабіць палітычную кар'еру, па прыкладзе другіх такіх-жа авантурыстых, што робяць яе ў радох сацыялістычнай, радыкальнай і іншых партый.

Наўрад ці партыя канчаткова аслабанілася ад такіх элемэнтаў. Таму, ня гледзячы на высьмейваньні ворагаў, **мы будзем працягваць чыстку,** каб стварыць сапраўдную камуністычную партыю в жалезнай ленінскай дысцыплінай.

Дарэмна нас абвінавачваюць у сэктанцтве: мы былі і застаемся **масавай партыяй,** як па сваім уплыве на рабочую масу, так і па ліку актыўных членаў. Мы заклікаем рабочых аб'яднацца вакол іх клясавай партыі і вакол іх газэты «Юманітэ».

Дэкларацыя 28 палітвязьняў—францускай кампартыі

ПАРЫЖ, 22. «Юманітэ» публікуе дэкларацыю 28 партработнікаў - камуністых, зьвыволеных урадам у турмы. Падпісаўшыя дэкларацыю, у тым ліку т. т. Марці, Манмуса, Кост і іншыя заяўляюць:

«Пазбаўленыя магчымасьці прымаць актыўны ўдзел у барацьбе, пацьвярджаем поўную салідарнасьць з палітыкай партыі і з усімі мерамі па ачысьцы і ўзмацненьні партыі і, у першую чаргу, мерамі ў адносінах да рэдакцыі «Юманітэ» і работы муніцыпальных саветчыкаў. Лічым, што павінны быць прыняты і далейшыя меры ў тым-жа кірунку». Дэкларацыя клеймёць муніцыпальных саветчыкаў, якія зьяўляюцца тыпічным прыкладам адыходу ад партыі хістаючыхся ліквідатарскіх апартуністычных элемэнтаў, якія спужаліся перад націскам рэакцыі і выдаюць з галавою свой апартунізм у пэрыяд абвастрэньня клясавай барацьбы.

* * *

ПАРЫЖ, 22. Палітбюро ФКП вітае заяву 28 пакутуючых у турмах партработнікаў - камуністых, як лепшы адказ на анты-партыйны паклёп, які распаўсюджваюць б рэнэгатаў і які з радасьцю падхвачаны буржуазным і сацыял-фашысцкім друкам. Палітбюро падкрэсьлівае, што парыскія рабочыя з абурэньнем праходзяць міма гэтага паклёпу, цьвёрда ведаючы, што разлагаецца не кампартыя, а іменна апартуністычныя і ліквідатарскія элемэнты, каторыя адкалоліся ад яе і якім зачынены ўваход у рабочую партыю. (ТАСС).

Новыя спробы нанесьці ўдар „Юманітэ"

ПАРЫЖ, 23. «Юманітэ» публікуе новы абмен лістамі паміж адміністрацыяй газэты і судовымі адміністратарамі рабоча-сялянскага банку. У адказ на апошні ліст судовых адміністратараў «Юманітэ» зноў прапанавала схэму выплаты доўгу газэты, ужо прынятую праўленьнем банку. Судовыя адміністратары безадкладна адказалі зноў адмовай на прапанову газэты і настойвалі на безадкладнай выплаце ўсяго доўгу, які вылічаны імі ў суме звыш 2 млн. франкаў.

У сувязі з гэтым абменам лістамі (ТАСС).

«Юманітэ» публікуе адозву да рабочых, у якой зазначае, што буржуазія паставіла сабе мэтай безадкладна ліквідаваць «Юманітэ» і перадаць яе у рукі ворагаў камуністычнай партыі і рабічае клясы. «Юманітэ» б'е трывогу і заклікае рабочых усьвядоміць, што калі да 30-га лістапада ня будзе сабрана яшчэ некалькі сот тысяч франкаў, дык пралетарыят страціць свой важнейшы друкаваны орган. Рэакцыйная прэса заклікае ўрад, не трацячы часу, пакончыць з «Юманітэ».

За бальшавіцкую непрымірымасьць

У БАРАЦЬБЕ СУПРОЦЬ ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ АБВШ СВАЯЧАСОВА І АДНАДУШНА ВЫКРЫЛА І ВЫПРАВІЛА ПАМЫЛКІ АСОБНЫХ Т. Т. У АЦЭНЦЫ АНТЫПАРТЫЙНАЙ ВЫЛАЗКІ АПАРТУНІСТАГА КУЗЬМІЦКАГА

У № 266 «Зьвязды» была дана падрабязная характарыстыка і ацэнка антыпартыйнай вылазцы Кузьміцкага ў АБВШ. Сёньня трэба разгледзець рад памылак, якія былі дапушчаны як з боку палітычнага кіраўніцтва і парт'ячэйкі АБВШ, так і з боку асобных таварышоў пры разглядзе пытаньня аб Кузьміцкім.

Разгляд гэтых памылак паказвае, да чаго можа прывесьці павярхоўны разгляд і немарксыцкі аналіз зьявішч, што мелі месца ў парт'ячэйцы АБВШ.

У пастанове Кастрычніцкага райкому КП(б)Б, у адным з пунктаў сказана «Бюро райкому зварачае ўвагу партарганізацыі АБВШ на тое, што наўкола данага антыпартыйнага выступленьня Кузьміцкага з боку асобных таварышоў былі праяўлены прымірэнчыя адносіны, жаданьне замазаць палітычную сутнасьць справы Кузьміцкага і г. д. Палітычнае кіраўніцтва школы дапусьціла памылку, калі не дабілася бальшавіцкага асьведамленьня данае справы, як справы, што носіць падвойна палітычны характар сярод пагалоўна ўсіх таварышоў партарганізацыі».

Гэты пункт пастановы бюро райкому і прадугледжвае тыя памылкі, якія былі дапушчаны пры вырашэньні пытаньня аб Кузьміцкім.

КУЗЬМІЦКІ—СЬВЯДОМЫ ПРАДСТАЎНІК ПРАВАЙ АПАЗЫЦЫІ

Кузьміцкі зусім ясна і членападзельна вылажыў пляцформу правай апазыцыі па асноўных пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва. Кузьміцкі ў адказ на пастанову лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб выключэньні з Палітбюро Бухарына, на апошняе папярэджаньне Рыкаву і Томскаму, зрабіў дзёрзкую вылазку супроць лініі партыі, супроць наступленьня на капіталістычныя элемэнты, супроць тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва. І, ня гледзячы на тое, асобныя таварышы з партарганізацыі школы паставілі пытаньне, а потым і ўхвалілі рэзалюцыі, што Кузьміцкі маральна разлажыўся, што Кузьміцкі—п'яніца, што гэта павінна заняць роўнае месца пры выключэньні яго з партыі. З гэтымі матывамі партыйны сход і выключыў з партыі Кузьміцкага. Вось рэзалюцыя, ухваленая сходам:

«Разам з гэтым (г. зн., Кузьміцкі ня згодзен з лініяй партыі—Н. К.) Кузьміцкі ў апошні час праявіў поўнае маральнае разлажэньне (п'янства, хуліганства), ня гледячы на рад папярэджаньняў». І далей у матывах выключэньня: «Прызнаючы ўсю няправільнасьць і шкоднасьць палітычных поглядаў Кузьміцкага ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, што супадаюць з поглядамі правай апазыцыі, а таксама поўнае яго маральнае разлажэньне, партсход пастанаўляе выключыць Кузьміцкага з партыі».

У гэтай пастанове партыйнага сходу АБВШ зусім ясна выявілася, што ячэйка не адважылася выключыць Кузьміцкага за прапаганду антыпартыйных поглядаў, якія несумяшчальны з прабываньнем у партыі, а таму ячэйка яшчэ аргумантавала выключэньне Кузьміцкага яго маральным разлажэньнем. З гэтае пастановы таксама відаць, што акалічнасьць бытавога парадку Кузьміцкага прытупіла палітычную вострасьць пытаньня, разбавіла выразную палітычную ацэнку, унесла сумненьні ў асяродзішча некаторых таварышоў з партарганізацыі. Гэта паказвае і тое, што палітычна-прынцыповая вышыня гэтага пытаньня была зьніжана да ўзроўню простага і немарксыцкага тлумачэньня зьявы (маральнае разлажэньне Кузьміцкага).

У ЧЫМ ЗАКЛЮЧАЛАСЯ ПАМЫЛКА АСОБНЫХ ТАВАРЫШОЎ?

Перад тым, як была ўхвалена партсходам гэта рэзалюцыя, разгарнуліся шырокія спрэчкі. Усе выступленьні таварышоў, за выключэньнем двух, асноўную ўвагу канцэнтравалі іменна на бытавым і маральным разлажэньні Кузьміцкага.

— Выступленьне Кузьміцкага ня мае ніякай ідэі.

— Кузьміцкі палітычна няпісьменны і сьляпы, як дзіця.

— Ён ад папоек разлажыўся так, як разлагаецца асеньні грыб пасьля асеньняга дажджу.

— У выступленьні Кузьміцкага відаць, што ён палітычна няпісьменны і хоча спэкуляваць на палітычным выступленьні.

— Апазыцыянасьць Кузьміцкага зьяўляецца непаразуменьнем і ва ўсім гэтым адыгрывае галоўную ролю алькаголь.

— Я бачу ў выступленьні Кузьміцкага манэўр, якім ён хоча замазаць сваё п'янства і хуліганства.

Такі быў тон выступленьняў у спрэчках пры ацэнцы дзёрзкай антыпартыйнай вылазкі Кузьміцкага.

Глыбокая памылка гэтых таварышоў заключаецца іменна ў тым, што яны зусім не разглядалі данага выступленьня ў сувязі з актывізуючай клясавой барацьбой у горадзе і ў вёсцы, з актыўным супроцьдзеяньнем кулака і нэпмана сацыялістычнаму наступленню.

Гэтыя таварышы акалічнасьць бытавога парадку палічылі за сутнасьць, узялі за выточнае палажэньне пры ацэнцы вылазкі Кузьміцкага і няўхіль на скаціліся да бяспрынцыпнасьці, да прымірэнчых адносін да справы Кузьміцкага.

З усяго матар'ялу відаць, што выступленьне Кузьміцкага супроць партыі ячэйку застала зьнянацку. Выступаўшыя таварышы зусім не разглядалі Кузьміцкага ў сувязі з яго лініяй, дзейнасьцю ў мінулым. На самой-жа справе, Кузьміцкі, яшчэ будучы ў лягерах, **выказаў падобныя погляды.** Значыцца, выступленьне 20-га лістапада мела за сабой сваю гісторыю і толькі заставалася без рэагаваньня з боку некаторых таварышоў і парторганаў.

Палітычнае кіраўніцтва школы, калі і ўзяло ў пачатку правільную палітычную ўстаноўку ў сувязі з выступленьнем Кузьміцкага, то не даяло яе да канца. Тады, калі спрэчкі набылі фальшывы напрамак з боку асобных таварышоў, трэ' было даць тон, выразны напрамак далейшым спрэчкам. Гэта ня было зроблена. Падругое, яўная памылка, якая была дапушчана і знайшла сваё выяўленьне ў рэзалюцыі, не атрымала цьвёрдага і рашучага пратэсту з боку палітычнага кіраўніцтва школай. І патрацяе, нельга было дапускаць такога становішча, каб асобныя таварышы вышлі з партыйнага сходу з няясным усьведамленьнем палітычнай сапраўднай сутнасьці выступленьня Кузьміцкага. Палітычнае кіраўніцтва школы гэтага не дабілася.

Вось група тых асноўных памылак, якія былі дапушчаны пры вырашэньні пытаньня аб выступленьні Кузьміцкага.

ПАРТ'ЯЧЭЙКА СВАЯЧАСОВА І ПОЎНАСЬЦЮ ВЫПРАВІЛА ПАМЫЛКУ

Кастрычніцкі раённы камітэт вылучыў свайго прадстаўніка для супольнага з ячэйкай разгляду дапушчаных памылак. Трэба сказаць, што **парт'ячэйка зусім пабальшавіцку і своячасова выправіла дапушчаныя памылкі.** Таксама своячасова і з усёй шчырасьцю прызналі свае памылкі асобныя таварышы з парт'ячэйкі АБВШ. Ва ўхваленай другой рэзалюцыі парт'ячэйка з усёй выразнасьцю фармулявала палітычную сутнасьць выступленьня Кузьміцкага.

Аднак, гэтыя ўрокі справы Кузьміцкага трэба значна пашырыць, бо яны кідаюць сьвятло на работу правай апазыцыі і цень на невыстарчальна часамі энэргічную і выразную работу асобных ячэек у барацьбе з ідэёвымі хістаньнямі, за лінію партыі.

ЯКІЯ-Ж УРОКІ, ШТО ВЫЦЯКАЮЦЬ З ВЫСТУПЛЕНЬНЯ КУЗЬМІЦКАГА

Папершае, тактыка правых ухілістых у фракцыйнай барацьбе з партыяй характэрна палітычным двурушніцтвам. Да пары, да часу «згаджацца» з лініяй партыі, у вузкім коле весьці прапаганду антыпартыйных поглядаў, а ў дзяжкі момант з усёй сілай паўстаць супроць лініі, супроць партыі.

Падругое, выступленьне Кузьміцкага і яму падобных з усёй яснасьцю паказвае, куды расьце і коціцца правы ўхіл, чыю ідэалёгію ён выказвае ў тэорыі і на практыцы. Выступленьне паказвае на непарыўную сувязь актыўнай дзейнасьці правага ўхілу супроць партыі з супраціўленьнем кулака і нэпмана, якія актывізуюцца ў горадзе і вёсцы. Во ь чаму трэба быць асабліва клясава-пільным і заўсёды ўзброеным для рашучай, ідэёвай і арганізацыйнай барацьбы з антыпартыйнымі поглядамі правых, не сумяшчальнымі з прабываньнем у партыі.

Патрэцяе, часта нашы партыйныя ячэйкі не даволі ведаюць і ўлічваюць асобных таварышоў на іх рабоце і праводзімыя імі лініі.

Асобныя таварышы часамі прыніжаюць палітычна-прынцыповую вышыню зьяў і фактаў.

Пачацьвертае, іншы раз, няўмела, няверна мы выхоўваем нашы маладыя партыйныя кадры на канкрэтных пытаньнях барацьбы за чыстату лепінскай лініі, за ідэёвую чыстату радоў нашай партыі.

Толькі выхоўваньне кожнага камуністага паасобку ў духу бальшавіцкай **нецярпімасьці** да ўсіх ідэёвых хістаньняў, толькі **рашучая** барацьба з антыпартыйнымі поглядамі, несумяшчальнымі з прабываньнем у партыі—забясьпечыць рашучую перамогу труднасьцяй, пасьпяховае прасоўваньне ўперад, ажыцьцяўленьне генэральнай лініі і ленінскае адзінства радоў партыі.

Н. Г. КОНЮХАЎ.

Партыйныя масы даюць руйнуючы адпор правым апазыцыянэрам

У Менску і Барысаве адбыліся шматлікія сходы парт'ячэек і партыйных калектываў па пытаньні аб апошнім пленуме Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б). Сходы аднадушна, цалкам і поўнасьцю далучаюцца да ўсіх пастаноў пленуму і рэзка асуджаюць антыпартыйную дзейнасьць правай апазыцыі.

Парткалектыў заводу «Энэргія» ва ўхваленай рэзалюцыі цалкам далучаецца да пастаноў пленуму і ўхваляе вывад т. Бухарына са складу Палітбюро і апошняе катэгарычнае папярэджаньне т.т. Томскаму і Рыкаву. У рэзалюцыі гаворыцца, што:

— Парткалектыў заводу «Энэргія» стаіць і будзе цьвёрда стаяць на варце Ленінскай лініі партыі і яе ЦК. Калектыў запаўняе бальшавіцкі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у сваёй поўнай гатоўнасьці з яшчэ большай энэргіяй праводзіць пастановы партыі па выкананьні пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва і з яшчэ большай рашучасьцю змагацца з правым ухілам і прымірэнцтвам, не паслабляючы ні ў якай меры барацьбы з «левымі» наскокамі на лінію партыі.

* * *

Партыйны калектыў **рабфаку,** цалкам і поўнасьцю ўхваляючы пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), канстатуе, што:

— Гіганцкія посьпехі партыі і рабочае клясы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, ажыцьцяўленьне і перавышэньне тэмпу выкананьня пяцігодкі, пасьпяховы ход хлебазагатовак, бурны рост камун і калгасаў, разгортваньне будаўніцтва буйных саўгасаў—дашчэнту разьбілі панікёрскія тэорыі правых капітулянтаў і яскрава давялі поўнае палітычнае банкрутства правай бухарынскай апазыцыі.

Сход, цалкам ухваляючы пастанову пленуму ЦК аб выводзе Бухарына са складу Палітбюро і апошняе папярэджаньне рэшце лідэраў правай апазыцыі, патрабуе ад групы Бухарына поўнага і шчырага прызнаньня памылковасьці сваёй капітулянцкай пазыцыі.

* * *

Агульны сход ячэйкі КП(б)Б фабрыкі **«Чырвоны Кастрычнік»,** заслухаўшы інфармацыю аб пастановах лістападаўскага пленуму ЦК, цалкам і поўнасьцю далучаецца да ўсіх пастаноў пленуму і лічыць зусім правільным вывад т. Бухарына са складу Палітбюро і папярэджаньне Томскаму і Рыкаву.

Сход патрабуе ад ЦК УсеКП(б) у выпадку парушэньня з боку правай апазыцыі апошніх пастаноў лістападаўскага пленуму ЦК ужыць далейшыя арганізацыйныя меры да правых апартуністых.

* * *

Агульны сход 5-й цэх'ячэйкі КП(б)Б заводу імя **Домбаля,** заслухаўшы інфармацыю аб пастановах апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастановы пленуму і лічыць, што дзейнасьць правай бухарынскай апазыцыі тармозіць тэмп індустрыялізацыі і ставіць такім чынам пад пагрозу нашае сацыялістычнае будаўніцтва.

Агульны сход цьвёрда заяўляе, што пад кіраўніцтвам Ленінскага ЦК мы выканалі з посьпехам першы год пяцігадовага пляну, з яшчэ большым посьпехам выканаем увесь пяцігадовы плян, ня гледзячы на хныканьне правых капітулянтаў. Ныцікам і малаверам з правага лягеру мы не дазволім тармазіць будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Сход ухваляе пастанову пленуму аб выводзе Бухарына са складу Палітбюро і папярэджаньне Томскаму і Рыкаву. Сход патрабуе ад гэтых таварышоў поўнага прызнаньня сваіх апартуністычных памылак, а ў выпадку далейшага парушэньня імі пастаноў партыі, сход настойвае перад ЦК ужыць да іх рашучыя арганізацыйныя меры.

У адказ на вылазкі правых апартуністых усе камуністыя заводу «Домбаль» уступаюць ва ўдарныя брыгады па сацыялістычным спаборніцтве.

Няхай жыве адзіная маналітная Ленінская партыя бальшавікоў і яе ЦК!

За выкананьне пяцігадовага пляну за 4 гады.

* * *

Агульны сход парт'ячэйкі **дэпо МББ чыг.** цалкам і поўнасьцю далучаецца да ўсіх пастаноў пленуму і ўхваляе вывад Бухарына са складу Палітбюро і апошняе папярэджаньне Томскаму і Рыкаву.

Мы лічым, што ў выпадку найменшай спробы з боку правых працягваць абарону сваіх антыпартыйных поглядаў і весьці барацьбу супроць партыі, ЦК павінен ужыць у адносінах да правых апартуністых далейшыя арганізацыйныя меры.

* * *

Сход парт'ячэйкі **майстэрань БСІК'а** вітае бальшавіцкія пастановы пленуму ЦК УсеКП(б) і ўхваляе вывад т. Бухарына са складу Палітбюро і папярэджаньне Томскаму і Рыкаву.

Сход папярэджвае правых капітулянтаў і іх лідэраў, што прапаганда антыпартыйных, антыбальшавіцкіх поглядаў правай апазыцыі несумяшчальна з прабываньнем у радох УсеКП(б).

Сход абяцае яшчэ больш разгарнуць бязьлітасную барацьбу з усялякімі ўхіламі ад лініі партыі, накіроўваючы галоўны агонь на правы ўхіл, як найбольш небясьпечны на даным этапе нашага будаўніцтва, не паслабляючы барацьбы з левымі наскокамі на лінію партыі і рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму.

Выкрыем да канца антыпартыйныя погляды правых банкрутаў

Пастанова бюро Магілеўскага АК КП(б)Б

Бюро Магілеўскага акруговага камітэту партыі, заслухаўшы інфармацыю аб выніках лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), поўнасьцю далучаецца да пастаноў пленуму і ўхваляе іх.

Бюро адзначае, што генэральная лінія партыі і бальшавіцкае кіраўніцтва ЦК забясьпечылі магутны ўздым і энтузіязм рабочае клясы ўсіх працоўных мас вакол задач далейшага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, вакол пытаньняў далейшага выкарчоўваньня рэштак капіталізму.

У выніку правільнага Ленінскага кіраўніцтва ЦК УсеКП(б) яшчэ больш узмацніўся саюз рабочае клясы з сялянствам і яшчэ больш узмацнілася кіраўнічая роля рабочае клясы ў гэтым саюзе.

Дасягненьні па індустрыялізацыі нашай краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі яскрава давялі поўнае палітычнае банкрутства правай бухарынскай апазыцыі і дашчэнту разьбілі тэорыі правых капітулянтаў, аб «дэградацыі» сельскай гаспадаркі, «ваенна-фэадальнай эксплёатацыі» сялянства, раўненьні на «вузкія» месцы і г. д.

Бюро АК ухваляе пастановы пленуму аб выводзе ідэолёга і тэарэтыка правага ўхілу т. Бухарына са складу Палітбюро і апошняе папярэджаньне рэшце лідэраў правай апазыцыі Томскаму і Рыкаву.

Бюро АК ад імя ўсёй партыйнай арганізацыі заяўляе, што партарганізацыя Магілеўшчыны будзе і надалей з бальшавіцкай непрымірымасьцю весьці яшчэ больш рашучую барацьбу з ідэалёгіяй і практыкай правага апартунізму, з прымірэнцтвам да яго, не паслабляючы ні на адну мінуту барацьбы з «левымі» загібамі і настроямі, з рэшткамі трацкізму.

Ачысьцім рады савецкіх журналістых ад чужых элемэнтаў

Што пастанавіла бюро Фрунзаўскага райкому КП(б)Б аб становішчы і рабоце рэдакцыі газэты „Рабочий"

Ва ўчарашнім нумары газэты «Рабочий» зьмешчан рад матар'ялаў аб асобных скажэньнях у практыцы рэдакцыйнага апарату газэты. Факты, якія мелі месца ў газ. «Рабочий», і паводзіны асобных яе працаўнікоў заслугоўваюць пільнае ўвагі і самага рашучага асуджэньня з боку ўсёй партыйна-савецкай грамадзкасьці.

У лютым г. г. супрацоўнік рэдакцыі газэты «Рабочий», загадчык аддзелам «Рабочая Жизнь»—**Мануйлаў** зьвярнуўся да другога супрацоўніка газэты Лінскага з просьбай затрымаць друкаваньне фэльетону па справе аб злачынствах у працкалектыве «Белпосредник». Падставай для гэтае просьбы зьяўлялася тое, што ў ліку асоб, якія абвінавачваліся па справе «Белпосредника» быў блізкі сваяк Мануйлава—яго дзядзька Файнштэйн. Калі фэльетон аб «Белпосреднике» («Лакен частного капитала») быў зьмешчаны, Мануйлаў парашыў адпомсьціцца Лінскаму і «прыпомніў» Лінскаму выпадак, калі апошні прасіў рабкора Левіна замяніць у заметцы прозьвішча яго, Лінскага, швагра—ініцыялямі. У заметцы ішла гутарка аб тым, што швагер Лінскага быў прыняты на работу па пратэкцыі. Аб ганебным учынку Мануйлава Лінскі маўчаў да таго часу, пакуль сур'ёзна з ім не пасварыўся і толькі пасьля гэтага Лінскі падаў заяву аб учынку Мануйлава. Мануйлаў быў зьняты з работы, але расьсьледваньне па гэтай справе працягвалася.

Мясцком рэдакцыі газэты «Рабочий» не ацаніў палітычнага значэньня ўсёй гэтай справы, ня ўлічваў таго, што Лінскі і Мануйлаў фактычна зьяўляліся агентамі клясавага ворага ў радох савецкіх журналістых, што яны (**Мануйлаў і Лінскі**) сваім учынкам дыскрэдытавалі савецкі друк і прыніжалі значэньне савецка-партыйнага друку ў разгортваньні крытыкі і самакрытыкі. Мясцком ня ўлічыў, што Мануйлаў і Лінскі, адказныя рэдакцыйныя работнікі, імкнучыся затрымаць апублікаваньне выкрываючага матар'ялу, абараняючы гэтым сваіх сваякоў, рабілі чужую, ня нашу, варожую нам справу.

Мануйлаў прасіў за асобу, якая аказалася клясавым ворагам, што пралезла ў савецкую ўстанову. Лінскі, пакрываючы Мануйлава, займаўся пратэкцыянізмам і прабаваў скарыстаць савецкі друк у сваіх асабістых інтарэсах. За гэтыя недапушчальныя агідныя ўчынкі, якія мяжуюцца з супрацоўніцтвам з клясавым ворагам, Лінскі і Мануйлаў зьняты з работы ў рэдакцыі і выкінуты з сям'і савецкіх журналістых. ЦП саюзу друкароў, правільна адзначаючы, што: «Зьяўляючыся па сутнасьці справы хадатаямі за клясавага ворага, Мануйлаў і Лінскі зрабілі ўчынкі, якія ганьбяць журналістага савецка-партыйнага друку, і пераходзілі на рэйкі супрацоўніцтва з клясавым ворагам», прызнала немагчымым далейшую работу Мануйлава і Лінскага ў савецка-партыйным друку. Замест звольненых Мануйлава і Лінскага для работы ў рэдакцыі вылучаны два рабочыя з вытворчасьці.—Для аздараўленьня абстаноўкі ў рабоце рэдакцыі АПАД ЦК КП(б)Б, Фрунзаўскі раённы камітэт партыі, акругком, ЦП саюзу і адміністрацыя газэты ўхвалілі рад мерапрыемстваў.

Падагульваючы ўсе гэтыя факты, нельга не адзначыць таго, што ўсе скажэньні ў практыцы рэдакцыйнага апарату мелі месца таму, што ў рэдакцыі ня была разгорнута самакрытыка.

Фрунзаўскі раённы камітэт партыі, надаючы вялікае значэньне гэтай справе, даў палітычную ацэнку фактам, што мелі месца ў газэце «Рабочий». У рэзалюцыі аб становішчы і рабоце газэты «Рабочий», ухваленай бюро АК КП(б)Б, гаворыцца, што партыйна-савецкі друк адыгрывае выключную ролю ў ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі па разгортваньні сьмелай пралетарскай самакрытыкі. У сьвятле гэтых задач, роля камуністых—работнікаў друку набывае асабліва важнае значэньне, як людзей, якія закліканы ажыцьцяўляць правільную партыйную лінію на асабліва адказным вучастку работы, у нашай прэсе.

Прызнаючы ў **асноўным правільнай палітычную лінію газэты,** рэзалюцыя адзначае, што ў практычнай рабоце апарату рэдакцыі «Рабочего» меў месца рад скажэньняў. Частка камуністых ня справілася з палітычным кіраўніцтвам газэты. Асобныя камуністыя аказаліся ў ідэёвым палоне ў беспартыйных работнікаў, якія былі зьвязаны з клясавым ворагам. У рэдакцыі ня была разгорнута самакрытыка, мелі месца факты сямейнасьці, кругавой парукі, зрастаньня асобных камуністых з чужым элемэнтам, перахлёстваньне самакрытыкі ў пагоні за таннай сэнсацыяй, ігнараваньне вылучэнцаў і г. д. Бюро РК адзначыла недапушчальны адрыў партыйнай часткі газ. «Рабочий» ад ячэйкі друкарні «Зьвязда», у сувязі з чым ячэйка несваячасова выкрыла ўсе хваравітыя зьявішчы ў рэдакцыі газ. «Рабочий». Адначасова бюро адзначыла адсутнасьць сыстэматычнага кіраўніцтва з боку ячэйкі партгрупай газэты «Рабочий».

За змазваньне недахопаў і хваравітых зьявішч у рэдакцыі «Рабочий», за нерэагаваньне на ўчынкі Мануйлава і Лінскага, як людзей, якія дыскрэдытуюць савецкую прэсу, бюро РК вынесла пастанову аб роспуску мясцкому газ. «Рабочий».

Бюро РК дало выразныя дырэктывы аб вылучэньні ў рэдакцыйны апарат рабочых ад варштагу і актыўных рабкораў. Раённы камітэт падкрэсьліў патрэбнасьць мабілізаваць грамадзкую думку наўкола справы рэдакцыі «Рабочего». Мы павінны завастрыць сваю ўвагу і асабліва ўвагу журналістых і работнікаў партыйна-савецкай прэсы наўкола пытаньняў аб палітычных задачах нашага друку і разгортваньні самакрытыкі ў саміх рэдакцыях Мануйлава і Лінскага, як людзей, якія дыскрэдытуюць савецкі друк у сваіх асабістых інтарэсах. За гэтыя недапушчальныя агідныя ўчынкі, якія мяжуюцца з супрацоўніцтвам з клясавым ворагам, Лінскі і Мануйлаў зьняты з работы ў рэдакцыі і выкінуты з сям'і савецкіх журналістых. ЦП саюзу друкароў, правільна адзначаючы, што: «Зьяўляючыся па сутнасьці справы хадатаямі за клясавага ворага, Мануйлаў і Лінскі зрабілі ўчынкі, якія ганьбяць журналістага савецка-партыйнага друку, і пераходзілі на рэйкі супрацоўніцтва з клясавым ворагам», прызнала немагчымым далейшую работу Мануйлава і Лінскага ў савецка-партыйным друку. Замест звольненых Мануйлава і Лінскага для работы ў рэдакцыі вылучаны два рабочыя з вытворчасьці.—Для аздараўленьня абстаноўкі ў рабоце рэдакцыі АПАД ЦК КП(б)Б, Фрунзаўскі раённы камітэт партыі, акругком, ЦП саюзу і адміністрацыя газэты ўхвалілі рад мерапрыемстваў.

Падагульваючы ўсе гэтыя факты, нельга не адзначыць таго, што ўсе скажэньні ў практыцы рэдакцыйнага апарату мелі месца таму, што ў рэдакцыі ня была разгорнута самакрытыка.

Фрунзаўскі раённы камітэт партыі, надаючы вялікае значэньне гэтай справе, даў палітычную ацэнку фактам, што мелі месца ў газэце «Рабочий». У рэзалюцыі аб становішчы і рабоце газэты «Рабочий», ухваленай бюро АК КП(б)Б, гаворыцца, што партыйна-савецкі друк адыгрывае выключную ролю ў ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі па разгортваньні сьмелай пралетарскай самакрытыкі. У сьвятле гэтых задач, роля камуністых—работнікаў друку набывае асабліва важнае значэньне, як людзей, якія закліканы ажыцьцяўляць правільную партыйную лінію на асабліва адказным вучастку работы, у нашай прэсе.

Прызнаючы ў **асноўным правільнай палітычную лінію газэты,** рэзалюцыя адзначае, што ў практычнай рабоце апарату рэдакцыі «Рабочего» меў месца рад скажэньняў. Частка камуністых ня справілася з палітычным кіраўніцтвам газэты. Асобныя камуністыя аказаліся ў ідэёвым палоне ў беспартыйных работнікаў, якія былі зьвязаны з клясавым ворагам. У рэдакцыі ня была разгорнута самакрытыка, мелі месца факты сямейнасьці, кругавой парукі, зрастаньня асобных камуністых з чужым элемэнтам, перахлёстваньне самакрытыкі ў пагоні за таннай сэнсацыяй, ігнараваньне вылучэнцаў і г. д. Бюро РК адзначыла недапушчальны адрыў партыйнай часткі газ. «Рабочий» ад ячэйкі друкарні «Зьвязда», у сувязі з чым ячэйка несваячасова выкрыла ўсе хваравітыя зьявішчы ў рэдакцыі газ. «Рабочий». Адначасова бюро адзначыла адсутнасьць сыстэматычнага кіраўніцтва з боку ячэйкі партгрупай газэты «Рабочий».

За змазваньне недахопаў і хваравітых зьявішч у рэдакцыі «Рабочий», за нерэагаваньне на ўчынкі Мануйлава і Лінскага, як людзей, якія дыскрэдытуюць савецкую прэсу, бюро РК вынесла пастанову аб роспуску мясцкому газ. «Рабочий».

Бюро РК дало выразныя дырэктывы аб вылучэньні ў рэдакцыйны апарат рабочых ад варштагу і актыўных рабкораў. Раённы камітэт падкрэсьліў патрэбнасьць мабілізаваць грамадзкую думку наўкола справы рэдакцыі «Рабочего». Мы павінны завастрыць сваю ўвагу і асабліва ўвагу журналістых і работнікаў партыйна-савецкай прэсы наўкола пытаньняў аб палітычных задачах нашага друку і разгортваньні самакрытыкі ў саміх рэдакцыях Мануйлава, займаўся пратэкцыянізмам і прабаваў скарыстаць савецкі друк у сваіх асабістых інтарэсах. За гэтыя недапушчальныя агідныя ўчынкі, якія мяжуюцца з супрацоўніцтвам з клясавым ворагам, Лінскі і Мануйлаў зьняты з работы ў рэдакцыі і выкінуты з сям'і савецкіх журналістых. ЦП саюзу друкароў, правільна адзначаючы, што: «Зьяўляючыся па сутнасьці справы хадатаямі за клясавага ворага, Мануйлаў і Лінскі зрабілі ўчынкі, якія ганьбяць журналістага савецка-партыйнага друку, і пераходзілі на рэйкі супрацоўніцтва з клясавым ворагам», прызнала немагчымым далейшую работу Мануйлава і Лінскага ў савецка-партыйным друку. Замест звольненых Мануйлава і Лінскага для работы ў рэдакцыі вылучаны два рабочыя з вытворчасьці.—Для аздараўленьня абстаноўкі ў рабоце рэдакцыі АПАД ЦК КП(б)Б, Фрунзаўскі раённы камітэт партыі, акругком, ЦП саюзу і адміністрацыя газэты ўхвалілі рад мерапрыемстваў.

Падагульваючы ўсе гэтыя факты, нельга не адзначыць таго, што ўсе скажэньні ў практыцы рэдакцыйнага апарату мелі месца таму,

2-ая СЭСІЯ ЦВК БССР

ДЗЯРЖАЎНЫ БЮДЖЭТ БССР у 1929-30 годзе ЎЗРАСТАЕ на 52 проц.

АСЫГНАВАНЬНІ НА НАРОДНУЮ ГАСПАДАРКУ ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА на 83 проц. НА ФІНАНСАВАНЬНЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ДЗЯРЖАВА АДПУСКАЕ 60 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ. 96,5 проц. ГЭТАЙ СУМЫ ІДУЦЬ НА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ АГРАМАДЖАНАГА СЭКТАРУ. У ГЭТЫМ ГОДЗЕ БУДУЦЬ БУДАВАЦЦА 55 НОВЫХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ. ВЫДАТКІ НА САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ ПАТРЭБЫ ПРАЦОЎНЫХ ДАСЯГАЮЦЬ 21 МІЛЬЁНУ 500 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

Сэсія ад імя працоўных БССР горача вітае байцоў Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі

З дакладу тав. Мікуліча

23-га лістапада на сваім вячэрнім пасяджэньні сэсія ЦВК БССР заслухала даклад Наркамфіна т. Мікуліча аб дзяржаўным бюджэце БССР на 1929-30 год.

Як-жа складзены бюджэт другога году пяцігодкі?

Дырэктывы партыі аб індустрыялізацыі краіны знайшлі свой належны адбітак у бюджэце на 1929-30 год. Адпаведна ўлічаны таксама і тэмпы калектывізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Значнае месца бюджэце адведзена пытаньням паляпшэньня дабрабыту і культурнага ўзроўню рабоча-сялянскіх мас. Асаблівая ўвага зьвернута на падрыхтоўку кадраў спэцыялістых, на падрыхтоўку рабочай кваліфікаванай сілы.

Для таго, каб упэўніцца ў тым, які гіганцкі рух уперад набывае наша народная гаспадарка, асабліва яе сацыялістычны сэктар, даволі прывесьці толькі некалькі лічбаў.

Бюджэт БССР у 1929-30 годзе ўзрастае на даволі вялікую суму. У параўнаньні з папярэднім 1928-29 г. бюджэт БССР на 1929-30 год узрастае **на 52 проц.** У аснову бюджэту пакладзены пяцігадовы плян разьвіцця народнае гаспадаркі і культуры БССР. У нашых спэцыфічных умовах мы павінны правесьці такія мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі паскарэньне разьвіцьця эканомікі краіны, сацыялістычную рэканструкцыю яе і хутчэй ліквідавалі-б пакінутую нам у спадчыну ранейшым ладам эканамічную і культурную яе адсталасьць. Асыгнаваньні на народную гаспадарку ў параўнаньні з мінулым годам павялічваюцца на 83 проц., або на 28 мільёнаў і 32 з лішкам тысячы рублёў, у тым ліку на прамысловасьць на 10 мільёнаў 350 тысяч рублёў, або 92,8 проц. і сельскую гаспадарку — на 10 мільёнаў 250 тысяч руб., або на 92,6 проц.

Выдаткі на сацыяльна-культурныя патрэбы таксама ўзрастаюць на 5 мільёнаў 887 тысяч рублёў — 37,7 проц.

Фонд заработнае платы ў 1929-30 годзе вызначаны ў суме **13 мільёнаў 468 тысяч рублёў**, павялічваецца ў параўнаньні з мінулым годам **на 29,9 проц.**

Растуць таксама сродкі і на капітальнае будаўніцтва ў прамысловасьці, галоўным чынам на будаўніцтва новых фабрык і заводаў. У параўнаньні з 1928-29 годам сродкі на капітальнае будаўніцтва павялічваюцца больш, чым на 100 проц. і будуць складаць звыш 51 мільёна рублёў. У гэтым годзе будзе будавацца 55 новых прадпрыемстваў, з якіх 28 будуць пачаты ў надыходзячым будаўнічым сэзоне. Найбольш значныя пабудовы па сваіх разьмерах вызначаны ў мэталёвай, папяровай, тэкстыльнай, лясной і скуранай прамысловасьці.

У галіне сельскай гаспадаркі ў будучым годзе вызначаны рост пасеўнай плошчы **на 4 проц.**, узьняцьце ўраджайнасьці ў індывідуальных гаспадарках **на 20 проц.**, калгасах — **25 проц.** і саўгасах — **на 30 проц.** На фінансаваньне сельскай гаспадаркі, прымаючы пад увагу тыя задачы, якія стаяць перад аграмаджаным сэктарам яе, дзяржава адпускае **больш за 60 мільёнаў рублёў.**

96,5 проц. гэтай сумы ідуць на забесьпячэньне аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі.

Пасеўную плошчу саўгасаў мяркуецца давесьці да 39 тысяч гэктараў, што дае ўзрост на 15,2 проц. Значныя сродкі ідуць таксама на жывёлагадоўлю, арганізацыю племянных пунктаў.

На калгаснае будаўніцтва ў будучым годзе будзе выдаткавана 32 мільёны 800 тысяч руб., супроць 6 мільёнаў рублёў у мінулым годзе.

Узрастаюць таксама выдаткі на сацыяльна-культурныя патрэбы, якія дасягнуць звыш 21 мільёну 500 тысяч рублёў — рост на 37,7 проц. Выдаткі на народную асьвету ўзрастаюць на 3 мільёны 435 тысяч руб., або на 30 проц.; на ахову здароўя — на 719 тысяч руб., або 33,5 проц.; на ахову працы і сацыяльнае забесьпячэньне — 104 з лішкам тысячы, або 65,3 проц.

Усе гэтыя паданыя лічбы даволі выразна сьведчаць аб тым, што Савецкая Беларусь у другім годзе пяцігодкі зробіць гіганцкі крок уперад у галіне сацыялістычнага будаўніцтва, індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

***

Пасьля дакладу т. Мікуліча сэсія заслухала судаклад бюджэтнай камісіі **(дакл. т. Платун)**, а таксама даклад тав. **Буніна** аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту ў 1927-28 г.

Прывітаньне Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі

На сэсіі з нечарговай заявай аб падзеях на савецка-кітайскай мяжы выступіў тав. Шчацько.

Сэсія пад гучныя воплескі ўсёй залі пастанавіла паслаць Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі наступную тэлеграму:

«Камандуючаму Далёка - Ўсходняй Асобнай Чырвонай арміі т. Блюхэру.

Другая сэсія ЦВК БССР горача вітае байцоў і камандна-палітычны склад Далёка-Ўсходняй арміі ад імя рабочых і сялян Савецкай Беларусі.

Працоўныя Савецкай Беларусі добра разумеюць, што ўсялякая небясьпека на Ўсходзе Савецкага Саюзу моцна зьвязана з небясьпекай на Захадзе і таму пільна сочаць за падзеямі на Далёкім Ўсходзе для таго, каб у кожную мінуту дапамагчы чырвоным байцом Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі.

Байцы Далёка-Ўсходняй арміі! Моцна стойце на варце межаў Савецкага Саюзу і будзьце ўпэўнены, што кожны з працоўных Савецкай Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюзу, заўсёды гатовы на дапамогу вам.

Няхай жыве Савецкі Саюз!
Няхай жыве Чырвоная армія!»

Старшыня Клімав. РВК тав. ТАРАСЕНКА, які рабіў даклад на сэсіі ЦВК аб стане калектывізацыі ў Клімавіцкім раёне

На абгаварэньне рабоча-сялянскіх мас

Даклад тав. Мікуліча аб дзяржбюджэце БССР на 1929-30 год выклікаў ажыўленыя спрэчкі, якія занялі ўсё раніцшняе пасяджэньне 24-га лістапада.

Выказаліся прадстаўнікі амаль усіх округ БССР.

У выступленьнях членаў сэсіі падкрэсьлівалася, што дзяржбюджэт на 1929-30 год дае надзвычайна вялікі рост у параўнаньні з мінулымі гадамі. Гэты рост ідзе разам з ростам усёй народнай гаспадаркі рэспублікі.

Прамоўцы аналізавалі паасобныя артыкулы бюджэту і ўнесьлі цэлы рад дадаткаў і прапаноў.

Шмат месца ў спрэчках занялі пытаньні аб разьмеркаваньні сродкаў па сацыяльна-культурным сэктары — па школьным будаўніцтве, ліквідацыі няпісьменнасьці, на клюбы, хаты-чытальні, ахову здароўя.

Часта з-за адсутнасьці інжынэрна-тэхнічных сіл і патрэбных будаўнічых матар'ялаў укладзеныя сродкі не даюць належнага эфекту.

Тав. Кудзін (Віцебская округа) прыводзіць такі прыклад. У Гарадоцкім раёне пабудавалі ў 1928 годзе новую школу, якая каштавала 20.000 руб., а ў гэтым годзе яна ўжо развальваецца. Такія-ж факты ёсьць і ў іншых раёнах.

Трэба павялічыць асыгнаваньні на падрыхтоўку кадраў.

Некаторыя члены ЦВК унесьлі практычныя прапановы аб пашырэньні крыніц прыбытковай часткі бюджэту. Зазначалася на патрэбнасьць больш шырока скарыстоўваць прыродныя багацьці рэспублікі.

Тав. **Ласкін** (Віцебшчына) гаворыць, што трэба ўзмацніць націск на кулака і нэпмана. Апошні закрыў краму, але ня спыніў гандаль і пашоў у падпольле. Фінорганы ня зусім энэргічна адносяцца да спагнаньня нядоімак з нэпманаў і гандляроў.

Усё яшчэ слаба праходзіць рэалізацыя 3-й пазыкі індустрыялізацыі на вёсцы. Некаторыя работнікі адносяцца надзвычайна нядбайна да гэтай важнай справы. У Добрамысьленскім раёне загадчык поштай за 2 месяцы рэалізаваў пазыкі на 10 руб. Настаўніцтва часта нічога ня робіць, каб пасунуць гэту справу ўперад.

Члены сэсіі паказвалі на тое, што дзяржаўны бюджэт БССР трэба перадаваць на абгаварэньне шырокіх мас рабочых і бядняцка-сераднядкага сялянства.

На гэтым-жа пасяджэньні тав. Мікуліч выступіў з заключным словам.

Дзеньнік сэсіі ЦВК

Сэсія вылучыла дэлегацыю з 12-ці членаў ЦВК для ўдзелу ў адкрыцьці ў Ждановічах зімовага дому адпачынку Менскай страхкасы.

Для прывітаньня ўсебеларускага зьезду латышоў сэсія вылучыла дэлегацыю з 7-мі чалавек.

Сёньня раніцшняе пасяджэньне сэсіі пачынаецца з 10-ці гадзін.

Парадак дня — даклад аб чыстцы савецкага апарату (т. Рыскін) і спрэчкі па дакладу.

Вячэрняе пасяджэньне — з 6-ці гадзін.

Парадак дня: спрэчкі і заключнае слова па дакладу аб чыстцы савецкага апарату, інфармацыйны даклад аб с.-г. выстаўцы (дакладчык т. Дубіна) і інфармацыйны даклад аб рэарганізацыі Віцебскай округі (дакладчык т. Конанаў).

Тав. КАТЛІНСКАЯ—член ЦВК (батрачка Грэскага раёну)

Разлажэньне апарату Барысаўскага аддзяленьня Лесбелу

Пад уплывам чужога элемэнту

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). У газэце «Зьвязда» была надрукавана заметка пад загалоўкам «Былыя гандляры і валютчыкі» ў Барысаўскім аддзяленьні Лесбелу. Спэцыяльная камісія, вылучаная Барысаўскім райкомам партыі, правярыла працу аддзяленьня Лесбелу. Камісія ўстанавіла, што Барысаўскае аддзяленьне Лесбелу на працягу некалькіх год скажала клясавую лінію партыі. Быў зажым самакрытыкі, ганеньне на рабкораў. У апараце аддзяленьня Лесбелу служылі чужыя нам людзі. Мелі месца таксама п'янства, сямейнасьць у працы і замазваньне ўсіх гэтых хваравітых зьявішч. Паміж работнікамі аддзяленьня наглядалася склока, усё гэта ўносіла дэзарганізацыю ў практычную работу.

Парт'ячэйка аддзяленьня Лесбелу таксама бязьдзейнічала. Заявы рабочых, якія пісалі аб непарадках у апараце аддзяленьня, бюро ячэйкі не разглядала на працягу цэлага году.

Нічога не рабіла для паляпшэньня працы апарату аддзяленьня Лесбелу і ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў, рабземлесу і мясцовыя арганізацыі. Ніякай палітвыхаваўчай работы не вялося. Рабочай праслойкі ў апараце Лесбелу зусім ня было.

Дырэктар Барысаўскага аддзяленьня Лесбелу тав. **Парыж** ня толькі не сыгналізаваў перад адпаведнымі органамі аб усіх гэтых фактах, аб разлажэньні апарату, а нават сам падпаў пад уплыў клясава-варожых элемэнтаў, якія працавалі ў аддзяленьні Лесбелу.

Барысаўскі райком партыі, разгледзеўшы ўсе матар'ялы абсьледваньня аддзяленьня Лесбелу, прыняў цэлы рад мер па аздараўленьні яго работы. Для працы ў аддзяленьне накіравана 10 рабочых. Зьвернута ўвага адпаведных арганізацый на разгортваньне самакрытыкі і ўцягненьне шырокіх рабочых мас ва ўсю сыстэму працы аддзяленьня Лесбелу. Дырэктару аддзяленьня тав. **Парыжу**, які не рэагаваў на ўсе гэтыя ненармальныя зьявішчы, абвешчана вымова, акрамя таго ён зьняты з працы. Зьняты з працы намесьнік дырэктара аддзяленьня Лесбелу былы купец і заводчык і ўзьнята пытаньне аб пазбаўленьні яго выбарчых праў.

На жаль, трэба канстатаваць, што меры, якія ўжыты да былых кіраўнікоў Барысаўскага аддзяленьня Лесбелу, вельмі мяккія. Так, напрыклад, тав. **Парыж** зараз чамусьці назначаны на адказную працу ў Наркамгандлі, хто можа даць гарантыю, што і тут ён ня будзе працаваць, як і раней.

В.

Адкрылася акруговая канфэрэнцыя ўдарных брыгад

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). 23-га лістапада ў Гомелі адкрылася першая акруговая канфэрэнцыя ўдарных брыгад. Прысутнічае 150 дэлегатаў. На канфэрэнцыі прадстаўлены буйныя прадпрыемствы округі. Ад Добрушу зьявілася 16 чалавек. З рапартам аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва выступілі дэлегаты фабрыкі «Гэрой Працы», «Пралетарый», «Рухавік Рэвалюцыі», «Палесдруку» і інш. На канфэрэнцыі арганізавана выстаўка сацыялістычнага спаборніцтва. У парадку дня канфэрэнцыі стаяць два пытаньні: плян будаўніцтва на 1929-1930 год і вынікі правядзеньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Агра-індустрыяльны камбінат—у Ляднянскім раёне

ВОРША. (Наш кар.). У газэце «Зьвязда» паведамлялася ўжо аб тым, што на Аршаншчыне будзе пабудаваны аграрна-індустрыяльны камбінат.

Сакратар Аршанскага акруговага камітэту партыі т. **Віленстовіч** заявіў наступнае нашаму карэспандэнту:

— Мы лічым, што Ляднянскі раён не ў адміністрацыйных, а ў гаспадарчых межах зьяўляецца адным з найбольш выгодных (як ільнаводных) для стварэньня буйнога агра-індустрыяльнага камбінату.

Сельская гаспадарка гэтага раёну пераважна раздробленая і цалкам хутарская. Зараз шпаркім тэмпам разьвіваецца калектывізацыя. Працоўнае сялянства Ляднаншчыны зразумела выгады ільнаводнай гаспадаркі, а таксама і пераход на калектыўную апрацоўку зямлі. Разгортваньню калгаснага будаўніцтва ў Ляднянскім раёне спрыяе таксама блізкасьць яго да Асінбуду і сельска-гаспадарчай акадэміі. У сувязі з масавай калектывізацыяй Ляднянскі раён узмацняецца належнымі кадрамі працаўнікоў. Акруговаму інспэктарыяту аховы здароўя і інспэктарыяту нарасьветы прапанавана рэарганізаваць сваю работу ў напрамку ўсебаковага абслугоўваньня калгасьнікаў.

Улічваючы ўсе гэтыя акалічнасьці, улічваючы вялізны размах калгаснага будаўніцтва ў Лядняншчыне, бязумоўна трэба прызнаць, што самым выгодным месцам для пабудовы агра-індустрыяльнага камбінату павінна быць іменна Лядняншчына.

У Прэзыдыуме Мен. АВК

Пабудова новай электрастанцыі. Прэзыдыум Менскага Акрвыканкому пастанавіў прасіць СНК абазвязаць ВСНГБ будаваць у Менску новую электрычную станцыю. Інжэнэру Алейнікаву прапанавана праект пабудовы новай электрастанцыі адаслаць у Маскву на кансультацыю.

Адкрываецца клюб працоўных латышоў. Прэзыдыум МенАВК даручыў акрінспэктарыяту нарасьветы ажыцьцявіць пастанову ЦВК БССР аб адкрыцьці ў Менску клюбу для працоўных латыскай і літоўскай нацменшасьцяй.

Перавучот мэдыцынскага пэрсаналу. З 5-га сьнежня будзе праводзіцца перавучот мэдпэрсаналу па акрузе. У горадзе перавучот даручана зрабіць інспэкцыі аховы здароўя і скончыць яго ў 2-хтыднёвы тэрмін. На раёнах-жа перавучот мэдпэрсаналу павінен будзе скончыцца праз месяц.

Дадатковае абсьледваньне саўгасу Менсельпрому. У саўгасах Менсельпрому доўгі час наглядаліся ненармальнасьці, аб якіх пісалася ў друку. Прэзыдыум АВК даручыў спэцыяльнай камісіі правесьці тэрміновае, дадатковае абсьледваньне саўгасаў Менсельпрому, пасьля чаго ўсе матар'ялы будуць накіраваны ў судовыя інстанцыі для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

На фронце сацыялістычнага будаўніцтва

НОВЫЯ ЗАВОДЫ

На працягу гэтага году будзе скончана пабудова наступных новых буйных прадпрыемстваў: **Бабруйскага** дрэваапрацоўчага камбінату, буйной запалкавай фабрыкі ў **Барысаве**, **Віцебскай** швэйнай фабрыкі, макароннай фабрыкі ў **Барысаве**, алейнага заводу ў **Віцебску**, заводу па выпрацоўцы мастаўя ў **Магілеве** і 5 новых цагелень.

У гэтым-жа годзе працягваецца будаўніцтва **машына-будаўнічага заводу** ў **Гомелі**, які каштуе 4 з паловай мільёны рублёў, **Нова-Беліцкага** дрэваапрацоўчага камбінату агульным коштам у 5 мільёнаў 700 тысяч, буйнога трыкатажнага камбінату ў **Віцебску**, на які асыгнавана 5 мільёнаў 300 тысяч руб. і найбольш моцнага ў БССР прадпрыемства—ільна-камбінату ў **Воршы**, які будзе каштаваць 9 з паловай мільёнаў руб.

***

Прэзыдыум ВСНГБ прызнаў мэтазгодным пабудаваць у г. Менску галалітавы завод. Пабудова павінна быць пачата з вясны 1930 г.

З вясны-ж пачнецца пабудова косьця-апрацоўчага заводу ў Магілеве.

ПЯЦІГОДКА ЯСЬЛЯЙ

Прэзыдыум ВСНГБ зацьвердзіў пяцігадовы плян будаўніцтва ясьляй на прадпрыемствах рэспубліканскай прамысловасьці. На пабудову ясьляй асыгнавана звыш 800.000 руб.

У бягучым годзе будуць пабудаваны ясьлі на панчошна-трыкатажнай фабрыцы ў Віцебску, на фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна" ў Нова-Барысаве.

РАСТУЦЬ КАЛГАСЫ

Сяляне вёсак Загаранскага сельсавету, Круглянскага раёну (Аршаншчына), пастанавілі арганізаваць сельска-гаспадарчую камуну імя газэты „Зьвязда" на плошчы 6 тысяч гэкт. зямлі. Нядаўна адбыўся сход упоўнаважаных усіх вёсак гэтага сельсавету, на якім быў прыняты і падпісаны статут камуны. Камунары паслалі прывітаньне газэце „Зьвязда".

***

Сяляне вёскі Чэпялёўка, Маслакоўскага сельсавету (Копыльскі раён) арганізавалі сельска-гаспадарчую камуну на плошчы 1000 гэктараў. У камуну ўступілі 92 бядняцка-сераднякцкія гаспадаркі. Сельска-гаспадарчая камуна названа „Маці Кастрычніцкай рэвалюцыі".

***

Гэтымі днямі арганізаваўся вялікі калгас у Сьвяцкім сельсавеце, Рагачоўскага раёну. У калгас уступіла 358 беднякоў і сераднякоў.

ПАРТЫЯ ПАТРАБУЕ палепшыць АБСЛУГОЎВАНЬНЕ рабочага СПАЖЫЎЦА

Да 1-га сьнежня па БССР павінны быць адчынены ў рабочых раёнах 123 новыя магазыны і 130 кіёскаў. Перавод гандлёвай сеткі на бесьперапынку. Шырока разгорнем развозку тавараў на дом і практыку папярэдніх заказаў. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна стаць пастаянным мэтадам работы працаўнікоў прылаўку. Пастанова ЦК КП(б)Б аб палепшаньні абслугоўваньня спажыўца і барацьбе з чаргамі павінна быць праведзена ў жыцьцё.

Партыя паставіла перад каапэрацыяй задачу ў бліжэйшы тэрмін прыняць захады да паляпшэньня абслугоўваньня рабочага спажыўца. Беларбсэкцыя зьвярнулася ва ўсе цэрабкопы з лістом аб правядзеньні ў жыцьцё гэтае пастановы.

На 1-га кастрычніка ва ўсіх акруговых гарадох, Добрушы і Шклове, налічвалася 1.080 каапэрацыйных гандлёвых пунктаў, у тым ліку 163 ларкі. У выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б Белрабсэкцыя дала заданьне цэрабкопам пашырыць сваю гандлёвую сетку. Да 1-га сьнежня па БССР павінны быць адкрыты дадаткова 123 магазыны, пераважна ў рабочых раёнах і на ваколіцах гарадоў. Зьвернута ўвага на арганізацыю правознага гандлю шляхам арганізацыі 130 кіёскаў і продажу фруктаў, гародніны, тутуню і дробнай галянтарэі і латкоў. Ва ўсіх акруговых гарадох арганізоўваюцца спэцыяльныя фургоны для развозкі газы.

Для зьнішчэньня перабояў у забесьпячэньні спажыўцоў усе магазыны таварамі шырокага спажываньня да 1-га сьнежня павінны перайсьці на бесьперапынны гандлёвы тыдзень. Большасьць магазынаў будзе пераведзена на 1½ і двухзьменную работу.

Да гэтага часу зранку наглядаліся чаргі за хлебам і за мясам, што тлумачылася ненармальным падвозам гэтых прадуктаў. Белрабсэкцыя прапанавала наладзіць транспарт гэтых тавараў з разьлікам, каб у кожным магазыне быў адпаўдзенны запас патрэбных тавараў.

Водпуск дэфіцытных тавараў павінен праводзіцца адначасова з усіх крам. Для высьвятленьня найбольш выгодных для спажыўцоў гадзін гандлю павінны праводзіцца рабочыя сходы пайшчыкаў асобных магазынаў.

Белрабсэкцыя прапануе цэрабкопам шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва магазынаў на лепшае абслугоўваньне і забесьпячэньне пайшчыкаў

Трэба вывучыць попыт спажыўцоў на той або іншы тавар і загадзя разважваць яго.

Да гэтага часу яшчэ вельмі мала ўжываецца мэтад папярэдніх заказаў і дастаўка тавараў на дом. Павінны быць ужыты меры да лепшага абслугоўваньня пайшчыкаў малаком, шляхам развозкі яго на дом.

Да 15-га сьнежня павінна быць закончана прымацаваньне пайшчыкаў да магазынаў.

Трэба арганізаваць рэгулярны нагляд і кантроль за работай гандлёвай сеткі шляхам уцягненьня ў гэту справу каапэрацыйнага актыву і шырокіх рабочых мас.

Менскі цэрабкоп таксама прыняў рад мер да паляпшэньня абслугоўваньня спажыўца.

На 1-га кастрычніка ў Менску было 180 магазынаў і ларкоў і 33 кіёскі. У бліжэйшы тэрмін будзе ў Менску **адкрыта 45 магазынаў** і рад ларкоў. Большасьць новых крам будзе адкрыта ў рабочых раёнах і на ваколіцах. Вялікай перашкодай да адкрыцьця новых магазынаў зьяўляецца адсутнасьць патрэбных памяшканьняў. Будаўнічыя арганізацыі ня ідуць насустрач у сэнсе пабудовы новых магазынаў у будуемых дамох.

Для зьнішчэньня чаргі ў магазынах пачата папулярызацыя сярод рабочых спажыўцоў папярэдніх заказаў. Кожны пайшчык зараз можа зайсьці ў магазын, зрабіць адпаведны заказ і праз некалькі гадзін без усякай чаргі атрымаць патрэбныя яму тавары. Пры ўсіх магазынах гатовае вопраткі адкрыты пераробачныя майстэрні.

Горш абстаіць справа з забесьпячэньнем насельніцтва малаком. Да гэтага часу малочны саюз падвозіць малако ў крамы вельмі позна, з прычыны чаго зьбіраюцца вялікія «хвасты». З пускам цэнтральнай малочнай будзе шырока праводзіцца дастаўка малака на дом.

У сувязі з ростам гандлёвай сеткі паўстае пытаньне аб падрыхтоўцы патрэбнай кваліфікаванай рабочай сілы. Цэрабкопам адкрыты курсы для падрыхтоўкі работнікаў прылаўку на 150 чалавек і курсы па павышэньні кваліфікацыі на 100 чалавек. Акрамя гэтага адкрыты курсы для вылучэнцаў-рабочых на пасады загадчыкаў магазынамі, на якія прынята 100 чалавек.

Цэрабкоп для лепшага бесьперабойнага забесьпячэньня магазынаў тавараў трапляе ў лапы Бразоўскаму.

Пайшчыкі скардзяцца

Уверх і ўніз

Калі прыходзіш у краму МЦРК **№ 163** па Жаўскай вул., каб купіць бульбу, цукар. Ёсьць у склеп, які знаходзіцца на ніжэйшы паверх, і калі бульбасьцюк знаходзіш гэты склеп, то ёсьць ісьці наверх, а калі, скажам, табе загадваюць ісьці ўніз, то, спускаецца за бульбу, не нагадваючы, што, спускаецца за бульбу, то ўніз, а, каб, тавар. Ці дзіцячую ўверх і ўніз, ці дзіцячую школьніку.

Для каго існуе крама

У першых числах лістапада МЦРК аб'явіў аб продажу рабочых ботаў, большасьць на 1½ і двухзьменную работу. Белсамправсаюз прадаў Менцрабкопу ботаў, большасьць размеру А калі ёсьць частка калі пайшчык прыходзіць у краму купіць кідё гусіны, прыказчыца адказвае: «мы можам адпусьціць толькі цэлую гусь». Між тым цэлая гусь каштуе на менш 6-7 руб., што зусім недаступна радавому рабочаму і служачаму.

Свой.

Якасьць абутку пагоршылася

За апошні час заўважваецца пагоршаньне якасьці абутку, які прадаецца ў крамах МЦРК. Дрэнны ня толькі сырэц, дрэнная і работа. Нікуды нявартны разьмер абутку. Белсамправсаюз прадаў Менцрабкопу ботаў рабочых ботаў, большасьць размеру А калі ёсьць частка калі пайшчык прыходзіць у краму купіць кідё гусіны, прыказчыца адказвае: «мы можам адпусьціць толькі цэлую гусь». Між тым цэлая гусь каштуе на менш 6-7 руб., што зусім недаступна радавому рабочаму і служачаму.

Свой.

Выканаць дырэктывы акругкому і ЦСПСБ

ТОЛЬКІ 5 ДЗЁН ЗАСТАЛОСЯ ДА МЕНСКАЙ АКРУГОВАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ЎДАРНІКАЎ

ЦП сельска-гаспадарчых рабочых нават не абмяркоўвала дырэктыў аб падрыхтоўцы да зьезду ўдарных брыгад

Больш увагі да дырэктыў партыі

На гледзячы на вялікае палітычнае значэньне, якое надаецца партыяй канфэрэнцыям ударнікаў, падрыхтоўка да Менскай акруговай канфэрэнцыі праходзіць вельмі слаба. Менскі акругком партыі і фракцыя ЦСПСБ далі партыйным і прафэсыянальным арганізацыям дырэктывы аб падрыхтоўцы. Аднак, праверкі ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў з боку прафарганізацый ня было.

Асобныя прафэсыянальныя арганізацыі не зьвярнулі на гэту важную палітычную кампанію належнай увагі. Асабліва нібыдзе аднесьлася да гэтага пытаньня ЦП саюзу сельска-гаспадарчых рабочых. Яно не абмяркоўвала нават дырэктывы аб падрыхтоўцы да канфэрэнцыі. Саўгасы зусім ня ведалі аб зьездах ударнікаў.

Слаба разгарнулася кампанія і на старонках менскіх газэт.

Усё гэта прымусіла адкласьці скліканьне Менскай акруговай канфэрэнцыі ўдарных брыгад з 23-га лістапада на 30-е лістапада, аб чым паведамлялася ўжо ў «Зьвязьдзе».

Трэба скарыстаць гэтыя дні для ўзмацненьня падрыхтоўчай работы.

Лепшыя ўдарнікі ідуць у партыю

ЗАВОД «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК»

У верасьні месяцы на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» арганізаваўся ўдарны цэх, у якім працуе 8 чалавек. У выніку: прадукцыйнасьць працы павялічана на 10,2 проц., якасьць прадукцыі значна палепшылася і г. д.

Па іх прыкладзе на заводзе арганізавалася яшчэ 5 брыгад, у якія ўвайшло 40 чалавек. Ня так даўно на заводзе быў сабраны сход, на якім падагулілі вынікі сацспаборніцтва і заключылі новы сацдагавор. Кожны цэх абмяркоўваў праект сацдагавору самастойна. Гэта выклікала нябывалую актыўнасьць рабочых, якія давалі напраўкі, прапановы, зьмены і інш. 20-га лістапада на ўрачыстым сходзе адбылося заключэньне сацдагавору. У гэты дзень увесь завод не працаваў (парашылі адпрацаваць гэты дзень у нядзелю). Арганізавана, з аркестрам музыкі пайшлі ўсе рабочыя са сваімі сем'ямі заключаць сацдагавор.

Піянэры выступілі з патрабаваньнем ад бацькоў — рабочых гэтага заводу — выканаць поўнасьцю і цалкам сацдагавор, спыніць п'янства, зьнішчыць прагулы і інш.

12 кваліфікаваных рабочых са стажам ад 6 да 33 год уступілі ў партыю а 6 маладых рабочых — у ЛКСМБ.

Зараз колькасьць брыгад павінна павялічыцца, бо паступаюць новыя заявы ад рабочых аб залічэньні іх ва ўдарныя брыгады.

ЦЫВЕС.

Шырэй разгарнуць культурна-выхаваўчую работу

(Нароўля, цукерная фабрыка «Чырвоны Мазыранін»)

МАЗЫР (Наш. кар). Гэтымі днямі адбылася канфэрэнцыя ўдарных брыгад цукерні «Чырвоны Мазыранін», у якой прымала ўдзел 28 брыгадзіраў, а таксама і ўсе рабочыя фабрыкі. Сацыялістычным спаборніцтвам на фабрыцы былі ахоплены ўсе цэхі, дзякуючы чаму была ўзьнята прадукцыйнасьць працы і зарплата. Так, па цьвёрда-цукерным цэху прадукцыйнасьць працы павысілася на 11,3 проц., а зарплата—на 24 проц., па мякка-цукерным цэху прадукцыйнасьць працы ўзьнялася на 16,5 проц., а зарплата—на 25 проц., на завёртачным цэху прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 15,8 проц., а зарплата—на 11,8 проц. Трэба адзначыць, што культурна-масавая работа і папулярызацыя сацспаборніцтва была пастаўлена ня зусім добра. Фабзаўком таксама не зварачаў належнае ўвагі не гэту важную кампанію. Але, ня гледзячы на гэта, рабочыя былі ўцягнуты ў сацспаборніцтва, дзякуючы чаму значна быў паменшаны выпуск браку, узьнята працадысцыпліна. Акрамя таго 31 рабочы падалі заявы аб тым, што яны добраахвотна павышаюць норму на 15 проц. Канфэрэнцыяй выбрана 10 дэлегатак на акруговы зьезд ударных брыгад, які адбудзецца ў Мазыры 10 сьнежня г. г.

ЯК КУЛАКІ НА ЧАЛЕ З ПАПОМ УЗРЫВАЛІ КААПЭРАЦЫЮ

Патрабуем высяленьня кулакоў і папоў-шкоднікаў

Пачынаючы з 1920 году, у **Раваніцкім** сельсавеце, Чэрвеньскага раёну, дзейнічала папоўска-паліцэйская група. Ядро групы складалася з наступных асоб: **папа** Івана Бразоўскага, яго брата Ўладзімера, былога **гандляра** і царкоўнага старасты, Гурыновіча і Кішко былых **паліцэйскіх** стражнікаў. Штаб групы знаходзіўся ў в. Юрэдыкі, дзе жылі кіраўнікі групы Бразоўскія.

Наколькі варожай была дзейнасьць гэтых элемэнтаў, відаць з таго, што вясною г. г. бядняцка-сераднякцкая частка в. Юрадыкі **катэгарычна патрабавала высяленьня Бразоўскіх з вёскі.** У сувязі з гэтай пастановай зараз уся група прыцятваецца да судовай адказнасьці. Сьледствам устаноўлена, што Бразоўскі і К° на працягу доўгіх гадоў займаліся **эканамічным шкодніцтвам і злоснай антысавецкай агітацыяй.**

«ПАПОЎСКІ КААПЭРАТЫЎ»

Вось некалькі яскравых фактаў, вельмі навучальных у сэнсе такгыкі клясавага ворага. У 1920 г. **поп** Бразоўскі Іван, карыстаючыся тым, што органы Савецкай улады на мясцох толькі што ствараліся, **захватвае** ў свае рукі мясцовы каапэратыў і становіцца яго **старшынёй. Свайго брата Ўладзімера** ён робіць загадчыкам крамы, а жонку—старшынёю рэвізійнай камісіі. Такім чынам, каапэратыў становіцца тітаральна кулацка-папоўскім аддзелам забесьпячэньня. Але гэтага мала. У 1921 годзе папоўская «тройка» інсцэнірує аграбленьне каапэратыву бандытамі, прычым палова «агрэбленых» тавараў трапляе папу Бразоўскаму.

Шалёную агітацыю Бразоўскіх, ім усё-ж не ўдаецца прайсьці ў праўленьне. Гэта больш злуе папоўска-кулацкую групу, але ня спыняе яе злачыннай працы. Разграміўшы каапэратыў і прысвоіўшы сабе палову тавараў, Бразоўскія зараз-жа адчыняюць сваю **ўласную краму.** Пад сваю антысавецкую агітацыю яны падводзяць эканамічную базу: капер, моў, сялянства цалкам у нашых руках.

ПАПОЎСКА-КУЛАЦКАЕ Т-ВА

Гэты манэўр Бразоўскім не ўдаецца: каапэратыў, пад кіраўніцтвам новага праўленьня з беднякоў і партыйцаў, становіцца на ногі, мацнее і вымушае Бразоўскіх сваю краму зачыніць. Але не падумайце, што папоўска-кулацкі штаб здаўся. Не, пацярпеўшы няўдачу ў спажывецкай каапэрацыі, Бразоўскія, пры актыўнай дапамозе былых паліцэйскіх Гурыновіча і Кішко і заможна-кулацкай часткі вёскі, у **1925** годзе арганізуюць **кулацкае** сельска-гаспадарчае таварыства. Старшынёй яго, зразумела, становіцца **брат папа Ўладзімер** Бразоўскі (тольки што зачыніўшы сваю ўласную краму).

Ці патрэбна расказваць аб тым, што, атрымаўшы ў свае рукі крэдыты, кулацка-папоўская група скарыстоўвала іх для ўзмацненьня **кулацкіх** гаспадарак, якім раздаваліся доўга-тэрміновыя крэдыты, дапускаліся розныя ільготы і паблажкі. **Інтарэсы беднаты** наўмысьля ігнараваліся, ёй адпускаліся толькі **кароткa-тэр

Сьмілавіцкі, Пухавіцкі і Лагойскі райкомы ПЕРШЫМІ ідуць у спаборніцтве па падпісцы на „ЗЬВЯЗДУ“.

АДСТАЮЦЬ: Нова-Беліцкі, Дубровенскі, Сураскі, Жлобінскі, Сьвіслацкі і Журавіцкі.

РАЙКОМЫ і ЯЧЭЙКІ! Не забудзьцеся, што да канца падпіснога месяца засталося ЎСЯГО 5 дзён.

Падвоім рады МОПР'у за лік батракоў, беднякоў і лепшай часткі серадняковў

Праз спаборніцтва і ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве замацуем ячэйкі МОПР'у

Арганізуем ва ўсіх калгасах і саўгасах ячэйкі МОПР'у

„Месячнік“ вярбоўкі

Адна з важнейшых задач, якая высоўваецца перад намі ў час усесаюзнага агляду ячэек МОПР'у—гэта правядзеньне «месячніка вярбоўкі» ў рады МОПР'у. Задача надкладная.

III-ці пленум ЦК МОПР'у БССР, абгаворваючы пытаньне аб росьце арганізацыі, канстатаваў, што значныя яшчэ колы працоўнага насельніцтва не ахоплены намі. Гэта асабліва датычыць працоўнага сялянства, удзельная вага якога ў МОПР'ы надзвычай слабая. Зусім не выпадковым зьяўляецца той факт, што на нашых акруговых канфэрэнцыях, якія адбыліся ўлетку, дэлегатаў-сялян трэба было шукаць «днём з агнём». Наша работа дагэтуль канцэнтравалася, галоўным чынам, у гарадох і мястэчках. Шырокія колы сялянства ў МОПР ня ўцягнуты і ў вялікай справе дапамогі замежным барацьбітом рэвалюцыі не бяруць удзелу. Вінаваты ў гэтым толькі мы. Нашы вясковыя райкомы МОПР'у ў большасьці сваёй нічога на робяць для ўцягненьня працоўнага сялянства ў МОПР і для разгортваньня на вёсцы работы па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных мас. Нашы акругкомы МОПР'у дагэтуль яшчэ не рэалізавалі пастаноў пленуму ЦК МОПР'у аб перанясеньні цэнтру цяжару сваёй работы на вёскі.

У часе ўсесаюзнага агляду ячэек МОПР'у мы павінны дабіцца пералому ў гэтым напрамку. Дагавары на спаборніцтва ў галіне ажыцьцяўленьня лёзунгу «падваеньня радоў МОПР'у» заключаны паміж акругкомамі і некаторымі райкомамі, але-ж як зыкопваюцца гэтыя дагаворы, яшчэ невядома. Нашым акругкомам і райкомам МОПР'у трэба строга ўлічваць, што ў нашай рэспубліцы ідзе шпаркім тэмпам калектывізацыя вёскі і нам трэба ў першую чаргу кінуцца ў саўгасы, калгасы, камуны. Мы кожны саўгас, калгас, кожную камуну павінны арабіць асноўным гняздом інтэрнацыянальнага выхаваньня саміх будаўнікоў сацыялізму на вёсцы. У кожным саўгасе, калгасе, у кожнай камуне павінна быць арганізавана ячэйка МОПР'у і праз саўгасы, калгасы і камуны мы зможам праводзіць наш уплыў і на іншыя колы працоўных вёскі.

Другая асноўная маса, якая ня ўцягнута ў МОПР і якая павінна быць у радох МОПР'у—гэта наша працоўная рабоча-сялянская моладзь. Гэта вялікая і здаровая сіла з невычэрпнай крыніцай рэвалюцыйнай энэргіі павінна быць сканцэнтравана на справе дапамогі зарубежным барацьбітом рэвалюцыі. Да гэтага заклікаюць нас тысячы і дзесяткі тысяч лепшых барацьбітоў пралетарыяту і рэвалюцыйнага сялянства, якія пакутуюць у бружвазных вастрогах і сярод якіх ня менш, чым 50 проц. ёсьць моладзі. У часе «месячніка вярбоўкі» мы павінны да максымуму ўцягнуць у рады МОПР'у рабочую і сялянскую моладзь, якая абавязана выступіць актыўна на дапамогу зарубежным барацьбітом рэвалюцыі. Камсамолія ў гэтай справе павінна быць застрэльшчыцай.

У вырашэньні гэтых задач нам дапаможа ўся наша савецкая грамадзкасьць, у першую чаргу партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, памятаючы, што справа МОПР'у ёсьць агульная наша справа.

КАЛМЫК.

Праз спаборніцтва палепшым працу

У мэтах узмацненьня дапамогі палітзьняволеным і папырэньня тэмпу па ўдзеле ў сацыялістычным будаўніцтве Савецкай краіны, **Бабруйская акруговая арганізацыя МОПР'у выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва Магілеўскую арганізацыю.**

Бабруйская арганізацыя абавязваецца да 1-га мая 1930 г. **павялічыць колькасьць членаў МОПР'у з 30.000 да 45.000** за лік батракоў, беднякоў, лепшай часткі серадняковў, вайскоўцаў і ўтрыманцаў рабочых і служачых; **арганізаваць 100 новых ячэек МОПР'у па вёсках; ва ўсіх калгасах і саўгасах арганізаваць мопраўскія ячэйкі,** правесьці ў горадзе і па ўсіх раёнах курсы мопраўскага актыву; **ліквідаваць усе віды запазычанасьці;** арганізаваць 50 новых мопраўскіх куткоў; **скончыць кампанію зімовай дапамогі да 1-га студзеня 1930 г., выканаўшы цалкам заданьне ў 6.000 руб.;** дабіцца пастаяннай сувязі з падшэфнымі турмамі, **пасылаць туды ня менш аднаго ліста ў 2 месяцы,** а таксама наладзіць сталы падлік членаў МОПР'у і актыву шляхам спаборніцтва паміж райкомамі і ячэйкамі.

Бабруйская арганізацыя МОПР'у спадзяецца, што ўсе абавязкі па дагаворы выканае на ўсе 110 проц., да чаго і заклікае Магілеўскую арганізацыю МОПР'у.

АЛЕСЬ ХМАРА.

Мопраўскі суботнік па пагрузцы бульбы

(Клічаў, Бабруйшчына)

Клічаўскі райком МОПР'у арганізаваў 9-га лістапада **мопраўскі суботнік па пагрузцы бульбы ў вагоны на ст. Несята.**

На заклік РК МОПР'у зьявіліся **некалькі соцень мопраўцаў, у тым ліку** старыя сяляне з вёсак Маргаўшчына і Зьмітроўка. Энэргічна ўзяліся за работу, бо **ўся пагрузка праходзіла ў парадку сацспаборніцтва.** Ня гледячы на тое, што адна з груп рабочых мопраўцаў складалася з аднэй моладзі, яна пагрузіла вагоны на 2 гадз. раней, чым іншыя групы.

Вялікай перашкодай у рабоце было тое, што з боку начальніка станцыі была праяўлена нядбайнасьць: не даставілі вагонаў на месца пагрузкі і эшалён з 10 вагонаў прыходзілася мопраўцам самім гнаць цэлы кілёмэтр да вызначанага месца. Але, ня гледячы на перабоі ў працы, **нагружана 5 вагонаў бульбы і ўся зарплата за пагрузку перадана ў фонд зімовай дапамогі палітзьняволеным.**

Кожны моправец на суботнік зьявіўся са сваім уласным мяшком ведаючы, **што не хапае мяшкоў для загатоўкі бульбы на ссыпным пункце.** Клічаўская нацыянальная ячэйка МОПР'у перадала Клічаўскай каапэрацыі **некалькі дзесяткаў забраных мяшкоў.**

Удзельнікі мопраўскага суботніку парашылі лічыць тых з раённага актыву, што не зьявіліся на гэты суботнік, дэзэртырамі.

ЛЕВІН.

Сурова караць кулакоў-тэрарыстых

Кулацтва ўпарта супраціўляецца сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі і ўжывае тэрор супроць асобных прадстаўнікоў партыі і ўлады на вёсцы.

Для прыкладу можна прывесьці нядаўняе выступленьне кулацтва вёскі Ляхаўшчына, Чавускага раёну (Магілеўшчына). У часе бядняцка-серадняцкага сходу, на якім стаяла пытаньне аб арганізацыі калгасу, кулакі праз вакно стрэлілі ў хату, дзе адбываўся сход. Яны хацелі забіць кіраўніка сходу Хатэнку. На шчасьце, усё абышлося без ахвяр. Калгас быў арганізаваны.

Раённая ўлада недаацаніла палітычнага значэньня гэтага выступленьня, абмежавалася тым, што заслухала вусную заяву т. Хатэнкі і накіравала на месца міліцыянэра для расьсьледваньня справы ў звычайным парадку.

З раду месц паступаюць весткі аб тым, што судовыя і іншыя органы часта недаацэньваюць палітычнага значэньня кулацкіх выступленьняў.

Бабруйскі «Камуніст» нядаўна паведаміў, што падкулачнікі вёскі Запольле Брыгайла і Маневіч за замах на забойства старшыні сельсавету Царыка асуджаны толькі на два гады зьяўволеньня. Нарсуд Клічаўскага раёну прыгаварыў падкулачніка Шамаля за замах на забойства члена сельсавету Станкевіча да 3-х год зьяўволеньня, але гэты прыгавор прызнаў умоўным, бо «замах ня меў небясьпечных вынікаў для жыцьця т. Станкевіча».

Газэта «Віцебскі Пралетары» нядаўна пісала, што кулакі, якія напалі на актывістага Котава і пераламалі яму нагу, прыгавораны да 1 году зьяўволеньня.

Мы лічым, што гэтыя прысуды зьяўляюцца няправільнымі і палітычна-памылковымі.

Трэба самым суровым чынам караць кулакоў-тэрарыстых і гэтым адбіць у кулацтва ўсякую ахвоту перашкаджаць калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

ЛАЗОЎСКІ.

З лістоў рабселькораў

Яшчэ аб мазырскіх растратчыках

Грамадзкасьць г. Мазыра добра ведае, як будаваўся вайсковы гарадок у 1927-28 годзе. Яна таксама ведае, як прапіваліся дзяржаўныя грошы, гуртам хадзілі на піўных прыватнікаў працаўнікі будаўнічай канторы № 40.

Нават сам начальнік канторы—**Грыве — ня раз піў у свайго касіра Ляхаўца,** а апошні часта наладжваў папойкі са сваімі сябрамі Шадлоўскім і сакратаром канторы Міхалевічам. **Нарэшце, у касіра Ляхаўца не хапіла 1.400 рублёў дзяржаўных грошай.**

Але наш **Ляхавец** ня дурны. Ён ведае, што **за яго плячыма стаіць моцная абарона** па чале з начальнікам канторы **Грыве.** Ён яго абвінавачваць ня будзе, але-ж для гэтага трэба знайсьці ахвяру і, такім чынам, прычапіці гэту віну рахункаводу **Іванову і бухгальтару Корзуну.**

Сьледзтва, бязумоўна, цаказала, што грошы растраціў касір **Ляхавец,** але суд Калінкавіцкага раёну **сьлепа паверыў прыяцелям Ляхаўца і злачынцу апраўдаў.**

Рабочыя ня стрывалі, бо ніхто не чакаў такога прысуду, і патрабавалі ад пракуратуры пераглядзець справу, у выніку чаго справа-растратчыка Ляхаўца была Вярхоўным судом скасавана.

І што-ж мы бачым? Замест папраўчага дому Ляхавец працуе загадчыкам камгасу Лельчыцкага раёну і нават Лельчыцкі РВК клапоціцца і мае пэўную надзею зноў апраўдзць Ляхаўца праз сваіх субутэльнікаў.

Справа прызначана для слуханьня 27-га лістапада. Рабочыя патрабуюць ад Калінкавіцкага суду добра пераглядзець справу, каб сурова пакараць растратчыка дзяржаўных грошай.

ВЕДАЮЧЫ.

Хто нам дапаможа

Пры пракладцы трамвайнай лініі па Старажоўскай вул. часова была зьнята электрычная лінія, ад чаго была спынена падача сьвятла ў цэлы рад дамоў па Старажоўскай вул., як напрыклад, у дом № 45.

Ад Эльводу быў выкліканы манцёр, які агледзеў лінію і сказаў, што адрамантаваць яе павінен камгас, бо папсаваньне зроблена пры пракладцы трамвайнай лініі і Эльвод за гэта не адказвае. Але калі зьвярнуліся ў камгас, дык апошні абяцаў, што паміж камгасам і Эльводам гэта пытаньне будзе ўрэгулявана.

Перагаворы вядуцца ўжо больш за месяц, а пакуль што рабочыя, якія пражываюць у дамох па Старажоўскай вул., сядзяць без сьвятла. Многія з іх займаюцца вечарамі ў школах і ня могуць дома займацца. Уставаць на работу прыходзіцца раніцой таксама без сьвятла.

Дык вось нас цікавіць, дакуль мы гэта будзем сядзець у цемры і ці хутка будзе зьнішчана гэта цяганіна.

Рабочы В. СЭГАЛЬ.

Суд

За эксплёатацыю хатняй работніцы

Гэтымі днямі працоўная сэсія разгледзела ў клюбе ярукароў у паказальным парадку справу супрадоўніка Белдзяржвыдавецтва гр-на **Адзарыхі,** які абвінавачваўся ў злосной эксплёатацыі сваёй хатняй работніцы **Бойкі М.**

Адзарыха, карыстаючыся несьвядомасьцю 65-ці гадовай бабулі **М. Бойка,** за 13 год службы ў яго не плаціў ёй пэнсіі, і прымушаў працаваць толькі за харчы, лічачы яе членам сваёй сям'і.

Калі-ж **М. Бойка** страціла працаздольнасьць і не магла ўжо працаваць так, як хацеў Адзарыха, апошні выгнаў Бойка з сваёй кватэры, і яна прымушана была жыць у суседзяй і жабраваць.

Суд пастаноўіў спагнаць з **Адзарыхі** ў карысьць М. Бойка 250 руб. Акрамя таго Адзарыха аштрафаваны на 300 руб. у фонд сацыяльнага страхаваньня.

Што новага ў эфіры

Праграма перадач менскай радыёстанцыі

ПАНЯДЗЕЛАК, 25-га лістапада.

17-00—Сялянская радыё-газэта (з польск. аддз.).
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з лат. аддз.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Гадзіна калектывістага.
20-30—Гутарка на нац. мове.
21-00—Канцэрт опэрнай музыкі.
23-00—Вывучэньне нямецкае мовы.

АЎТОРАК, 26-га лістапада

17-00—Час піянэра і вучня.
17-30—Палітычныя перадачы.
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з яўрэйск. аддз.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Радыё-аматар.
20-30—Сялянская вячорка.
22-00—Трансляцыя савецкіх і замежных станцый.

ТЭАТР

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр

«БАРАЦЬБА МАШЫН Ц. ДАЎГАПОЛЬСКАГА

Наш дзяржаўны яўрэйскі тэатр у пошуках сучаснай п'есы, якая адбівала-б сёньняшні дзень пралетарыяту, яго жыцьцё і барацьбу за індустрыялізацыю, спыніўся на п'есе Ц. Даўгапольскага—«Барацьба машын». Ц. Даўгапольскі—яўрэйскі літаратар і журналісты—упяршыню выступіў перад намі, як драматург.

П'еса, у якой мы знаходзім рознастайныя элемэнты драматургічнага мастацтва—драму, сатыру, апэрэту і нават фарс (інтэрмэдыя «міква»)—пакідае нейкае дваістае ўражаньне. Уся апэрэтачна-буфонная частка п'есы дана дасканала—тут і аўтар і пастаноўшчык (М. Рафальскі) дапоўнілі адзін другога. І ў выніку атрымалася поўная фарбаў галерэя тыпаў адыходзячага ў мінулае старога яўрэйскага сьвету—клерыкалаў, былых фабрыкантаў, іх на хлебнікаў і падхалімаў—больш дробных чужаедаў. Арыгінальнасьць, парадыйнасьць палажэньняў, жывы бойкі дыялёг, дасьціпныя рэплікі—усё гэта ўзмацніе ўражаньне і трымае глядача ўвесь час у вясёлым настроі, прымушаючы яго ня толькі ўсьміхацца, але і моцна сьмяяцца.

Калі-б п'еса да канца была вытрымана ў сатырычна-гратэскных тонах, то мы-б маглі горача прывітаць аўтара, а разам з ім і тэатр з добрым здабыткам, бо добрая сатыра і апэрэта нам таксама вельмі патрэбна і карысна, а гэты від мастацтва ў нас яшчэ вельмі мала разьвіты. Але аўтар не хацеў ся бе «прыпісіць» да сатыры-буфанады, яго мэтай было даць сур'ёзную п'есу індустрыяльнага характару з адлюстраваньнем барацьбы старых і новых пачаткаў на сучаснай фабрыцы. І тут нашага пралетарскага глядача чакае расчараваньне, тут мы маем пэўны зрыў.

Барацьба на тэкстыльнай фабрыцы разгортваецца вакол установкі на фабрыцы новых машын. Частка адсталых рабочых, якая падтрымліваецца фабкомам, змагаецца супроць устанаўленьня новых машын, не жадаючы прыстасавацца да новых умоў. Перадавая камсамольская частка рабочых, апіраючыся на чырвонага дырэктара і фабрычную ячэйку, энэргічна змагаецца за ўвядзеньне новых машын, за рэканструкцыю фабрыкі. Перамагаюць перадавыя сілы фабрыкі.

Але гэта тэма. цікавая сама па сабе, распрацавана непераканаўча, схэматычна, а мясцамі гучыць фальшыва. У сучасных умовах фабком у саюзе з адсталай часткай рабочых рэзка выступае супроць рэканструкцыі фабрыкі і горача змагаецца з ячэйкай, з адміністрацыяй—дзе мы гэта бачылі, дзе мы гэта чулі? На якой савецкай фабрыцы рабочых, не прыстасаваных для работы на новых машынах, зьбіраюцца не перакваліфікоўваць, а перадаць у саматужныя арцелі?

Вось перад намі адна з цэнтральных фігур п'есы—чырвоны дырэктар Дрэйзін—гэта камуністы, рабочы-выдуўнец, які на працягу 6 год свайго дырэктарства ператварыў фабрыку з саамтужнага ў буйное індустрыяльнае прадпрыемства. Але ў Дрэйзіне, як ён намаляваны аўтарам і паказаны на сцэне (артысты Сокал), мы ня бачым і не адчуваем пралетарскага загартаваньня, моцнага бальшавіцкага касьцяка. Мы бачым Дрэйзіна ня толькі ва ўзаемаадносінах з рабочымі, але таксама ва ўзаемаадносінах з жонкай Зояй і яе бацькам, заядлым клерыкалам, заклятым ворагам савецкай улады, домаўласьнікам Рабінакам. Дрэйзін прыходзіць у кватэру Рабінака па жонку, і тут адбываецца сутычка паміж ім і сьвёкрам Рабінак нагла і адкрыта зьдзекуецца над савецкай уладай, над ім, Дрэйзіным—прадстаўніком клясы-пераможцы. А чырвоны дырэктар-партыец замест таго, каб плюнуць Рабінаку ў яго брудны і наглы твар, замест таго, каб перадаць шкодніка ў моцныя рукі ДПУ, закладвае рукі ў кішэні і моўчкі глядзіць на Рабінака поглядам, які павінен выказаць пагарду. Фальшывасьць і ненатуральнасьць сітуацыі б'е ў вочы рабочаму глядачу.

Зою—жонку Дрэйзіна—разьвінчаную інтэлігенку, якая недалёка адышла ад разлагаючай атмасфэры Рабінакаў, пустую жанчыну, якая фліртуе з белагвардзейцам Фіпманам, аўтар чамусьці ідэалізуе і стараецца выкліканць да яе сымпатыю ў глядача. Надорваная, бач, інтэлігентка хоча шчыра працаваць на фабрыцы, аблізіцца з пралетарыятам, але гэтага ня выходзіць. На справе Зоя ўсімі сваімі паводзінамі кампрамэтуе чырвонага дырэктара Дрэйзіна і разлагаючым чынам уплывае на фабрычны быт, калі яна там зьяўляецца і прабуе працаваць, стараючыся знайсьці забаву для сваёй «сумуючай душы».

У п'есе ёсьць яшчэ цэлы рад зрываў і ляпсусаў. Адначым яшчэ толькі наступную палітычна няправільную рыску—адкрыта-гнала і задзірыста вядзе сябе цесная група яўрэйскіх клерыкалаў і былых фабрыкантаў з Рабінакам на чале, супраціўляючыся нашаму наступленьню і не сустракае таго моцнага адпору, які дае партыя і рабочая кляса вылазкам клясавага ворага.

Пастаноўшчык М Рафальскі ў мастацкім афармленьні п'есы паказаў шмат уменьня, добрую выдумку і арыгінальнасьць сцэнічных палажэньняў. Можна толькі спрачацца наконт празьмернага імкненьня пастаноўшчыка пасьмяшыць глядача, ашарашыць, ня спыняючыся перад чыста фарсавымі трукамі.

Выкананьне, як заўсёды ў яўрэйскім тэатры,—моцнае і выразнае, адчуваецца вялікая сыгранасьць. Адначым толькі выкананьне дзьвюх роляй. Аронес у ролі Рабінака дае надзвычайна яскравую фігуру і часамі нагадвае такога буйнога майстра сцэны, як Міхоэльс (Маскоўскі дзяржаўны яўрэйскі тэатр). Затое надзвычайна слаба і бледна вядзе ролю дырэктара Сокал і яшчэ больш паглыбляе нявернасьць данага аўтарам пэрсанажа.

Л. Н—даў.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Клюб навуковых працаўнікоў. Расклад масавай працы з 30/XI-1/1-30 г.

30 XI-1929 г. Агульны сход навуковых працаўнікоў. Даклад праф. Вальфсона на тэму: «Рэарганізацыя ВНУ у сувязі з рэканструкцыяй народнай гаспадаркі».

5 XII. Даклад праф. **Кроля і Бузука** аб уражаньнях ад паездкі за межы ў 1929 годзе.

10 XI. Вечар самькрытыкі па Мэдфаку.—уступнае слова праф. Вальфсона.

20/XII. Даклад праф. **Выдры** на тэму: «Чарговыя задачы навуковых працаўнікоў у сувязі з філёзофскай дыскусіяй».

30/XII. Агульны сход навуковых працаўнікоў. Даклад т. Сянькевіча на тэму: «Праблема навуковых кадраў БССР».

Пачатак вечароў роўна а 8 з паловай гадз. увечары.

Уваход для членаў сэкцыі навуковых працаўнікоў вольны.

Дом Асьветы. Сёньня заняткі гурткоў: па рэвалюцыйным руху а 7 гадз. і па палітэканоміі—а 8 гадз. увечары.

БДУ. 25-га лістагада, а 5 гадзіне ўвечары ў актавай залі унівэрсытэту—агульны сход студэнтаў і выкладчыкаў сацыяльна-гістарычнага аддзяленьня Пэдфаку. Просьба зьявіцца ўсім навуковым працаўніком, якія працуюць на гэтым аддзяленьні.

Бюро ячэйкі КП(б)Б заводу «Дрэваапрацоўшчык» паведамляе, што ў аўторак, 26-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу дрэваапрацоўшчыкаў (Савецкая, 125) пачынаецца чыстка ячэйкі КП(б)Б заводу «Дрэваапрацоўшчык».

Запрашаюцца ўсе рабочыя заводу, а таксама іншых прадпрыемстваў.

Бюро ячэйкі.

Дом Камасьветы. 25-га лістапада, а 7 гадзіне ўвечары ў партбібліятэцы адбудзецца індывідуальная кансультацыя па анты-рэлігійнай прапагандзе на другой тэме «Пахаджэньне сьвету».

Просьба да ўсіх кіраўнікоў анты-рэлігійных гурткоў, якія ня былі на сэмінары, зьявіцца на кансультацыю.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“
Сёньня і штодзенна
2-гі тыдзень! 2-гі тыдзень!
БЭСТЭР КІТОН
у амэрыканскай камэдыі
ГЕНЭРАЛ
у 7 частках.
Пачатак сэансаў а 7 г. увеч, Каса ад 5 а пал. гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“.
Ад панядзелка, 25 лістапада,
Выключна мастацкі фільм
ЧОРНЫ ПАРУС
Драма ў 6 частках.
Звыш праграмы хроніка „СОВКИНО“ № 65.
1. Дакумэнты кітайскай правакацыі.
2. Група слаўных абаронцаў савецкіх межаў, якія вызначыліся ў бае 18 жніўня.
3. Кастрычнік—рашаючы месяц хлебазагатовак.
4. Пяцігодка ў дзесяньні.
5. Будучы курорт.
6. На пляжы.
7. Узбэкістан.
ПАЧАТАК 1 сэансу а 7 г.—КАСА—ад 5 г.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“
АД ПАНЯДЗЕЛКА 25 лістапада
Бытавая КАМЭДЫЯ З ПРАЛЁГАМ
ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА
Рэжысэр—І. Пыр'ёў
Апэратар—В. Саладоўнікаў
Мастак—Д. Калуваеў
ГАЛОЎНЫЯ РОЛІ ВЫКОНВАЮЦЬ:
Пракурор Казірынаў—І. Мазулеўскі,
яго жонка—Е. Н. Жызьнева,
І. Кандырын і інш.
Звыш праграмы кіно-хроніка Белдзяржкіно
НОВЫ ГОРАД
(ГОМЕЛЬШЧЫНА)
Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр «ЮНЫ ПІЯНЭР»
(БУДЫНАК КІНО («ПРАЛЕТАРЫ»)
Ад панядзелка 25 лістапада
ЯНКА І МСЬЦІВЕЦ
У 6 частках
У галоўных ролях В. Кольмэн і дрэсыраваная няньчная аўчарка Тасса
Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня.

Кіно „СПАРТАК“
З ПАНЯДЗЕЛКА, 25 лістапада
выдатны амэрык. трука-прыгодніцкі фільм
ЖАНЧЫНА СЫШЧЫК
(«ПАНОПТА») у 8 част.
Пачатак а 6 гадз.—КАСА—ад 5 гадз.

Культуправление Центросоюза РСФСР
ОБ'ЯВЛЯЕТ
КОНКУРС на лучший ПРОЕКТ сумки ДЛЯ КНИГОНОШЕЙ
УСЛОВИЯ КОНКУРСА:

1. Конкурс проводится в целях привлечения широкого круга местных работников, особенно кооперативных и книжных к выработке наиболее удобной и совершенной формы сумки или ящика для книгоношек.
2. Желательно, чтобы представленные на конкурс проекты сумок (ящиков) отвечали следующим условиям:
а) товаров должно вместиться на 25—30 рублей, из коих на 5—6 руб. мелкого канцелярско-писчебумажного товара, на несколько (2—4) руб. портретов и картин и на остальную сумму литературы;
б) сумка должна быть УДОБНА для перевоски, как при переходе из села в село, так и при переходе из дома в дом;
в) вес сумки или ящика без товара должен быть не больше 2½ килогр;
г) внутреннее устройство должно предусмотреть наличие около 10 отделений, разделенных передвижными перегородками, что должно позволить уменьшать или увеличивать, как общее число отделений, так и размеры отдельных из них;
д) должна быть возможность уложить портреты и картины в несвернутом виде;
е) устройство сумки (ящика) не должно мешать быстрому раскрытию и развертыванию ее;
ж) для удобства торговли на базарах и собраниях сумка в развернутом виде должна представлять собой небольшой книжный прилавок с маленькой витриной и дать яркую эффективность;
з) должна предохранять от проникновения воды;
и) стоимость сумки (ящика) при массовом ее изготовлении не должна превышать 7-ми руб. за штуку;
к) изготовление сумок должно быть предусмотрено из такого материала, который можно достать в количестве необходимом для изготовления 15—20.000 сумок.
3. Срок представления проектов на конкурс не позже 1-го января 1930 года.
4. Все без исключения присланные проекты будут выставлены в начале января 1930 года для обозрения на Всесоюзном С'езде книгонош.
5. Премироваться будут 5 лучших проектов, из коих 1-й принятый конкурсной комиссией и рекомендованный ею для всей потребсистемы в сумме 250 руб., 2-й в сумме—150 руб. и остальные 3—по 50 руб.
6. Определение лучших проектов и присуждение премий будет произведено не позднее чем через 2 недели по окончании Всесоюзного С'езда книгонош.
7. Состав комиссий 5 человек: 2 от книжного Отдела Ц—за, 1—от Отдела Рационализации Центросоюза и 2—от С'езда Книгонош.
8. Проекты (чертежи или макеты с подробным описанием) должны быть представлены в Книжный Отдел Культуправления Центросоюза (Москва, Маросейка, 7) в запечатанных конвертах с надписью «для конкуса».

Па даручэньні Цэнтр. Праўленьня саюзу будаўнікоў Беларусі,
РЭСПУБЛІКАНСКАЕ БЮРО ІТС абвяшчае адкрытым
АРХІТЭКТУРНЫ КОНКУРС
на пабудову клюбу саюзу будаўнікоў у г. Менску.
За лепшыя праекты па прысуджэньні журы будуць выданы
4 прэміі па 250 руб.
Тэрмін падачы праектаў—ДА 1-га ЛЮТАГА 1930 г.
Умовы конкурсу і праграму будаўніцтва можна атрымаць штодзенна ў ЦП саюзу (Дом Працы, 3-ці паверх) ад 12-ці да 3-х гадз. дня.
Рэспубліканскае Бюро ІТС.

Па МАТЭМАТЫЦЫ
і фізыцы ў ВНУ, тэхнікумы і інш. пасьпяхова рыхтуе
настаўнік БЕЛКІН
(шматгадовы вопыт)
Ракаўская 4, кв. 15, штодзенна ад 9—11 гадз. раніцы і ад 5—7 гадз. увеч.

Я, Натальля Бялюсьціна, адмаўляюся ад свайго бацькі Андрэя Іванавіча Бялюсьціна, які пражывае ў сяле Сяльцы, Рэчыцкага раёну, Гомельскай акругі, бо ён зьяўляецца папом, г. зн. ворагам нашага непераможнага савецкага ладу, пры якім мы сьмела і бадзёра ідзем уперад. З 1929 году 24 лістапада я парываю ўсякую сувязь з ім.
НАТАЛЬЛЯ БЯЛЮСЬЦІНА.

50 К. Кошт публікацыі аб згубе даўкмэнтаў

ЗЬВЯЗДА
ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
НА КЛІШЭ
ШТРЫХОВЫЯ ТОНАВЫЯ СЕТКА І ЦВЕТНЫЯ
МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ
З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“—МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63.
ПАРТРЭТЫ, ПЛЯКАТЫ, ПЛЯНЫ, СХЕМЫ, МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.
Менск, Галоўлітвыд № 337.